Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

29 ЖНІЎНЯ 2008 г.
ПЯТНІЦА
№ 162
(26275)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## Аляксандр Лукашэнка прапанаваў разгледзець пытанне па Паўднёвай Асеціі і Абхазіі на саміце АДКБ 5 верасня

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 28 жніўня накіраваў пасланне Прэзідэнту Расійскай Федэрацыі Дзмітрыю Мядзведзеву, у якім, у прыватнасці, адзначана, што ў сітуацыі, якая склалася, у Расіі не было іншага маральнага выбару, акрамя як падтрымаць зварот народаў Паўднёвай Асеціі і Абхазіі аб прызнанні іх права на самавызначэнне ў адпаведнасці з асноватворнымі міжнароднымі дакументамі.**

Кіраўнік беларускай дзяржавы таксама выказаў думку аб мэтазгоднасці вынясення гэтага пытання на разгляд Савета калектыўнай бяспекі АДКБ, правядзенне якога запланавана на 5 верасня 2008 года, і прыняцця кансалідаванай пазіцыі дзяржаў-удзельніц.

Прэзідэнт запэўніў, што Рэспубліка Беларусь застаецца надзейным і паслядоўным саюзнікам Расіі.

**БЕЛТА.**



Фота БЕЛТА.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «Правядзенне Фестывалю хакея ў Беларусі — прызнанне сістэмнай работы дзяржавы па развіцці спорту і фізкультуры»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адкрыў міжнародны турнір аматараў хакея, які пройдзе ў Мінску па 31 жніўня ў рамках Фестывалю хакея, прысвечанага святкаванню 100-годдзя Міжнароднай федэрацыі хакея і Года здароўя ў Беларусі.**

У сваёй прамове на цырымоніі адкрыцця Аляксандр Лукашэнка назваў сімвалічным тое, што Фестываль хакея і міжнародны турнір, прысвечаны гэтай знамянальнай падзеі, праводзяцца ў нашай краіне. «Лічу гэта прызнаннем з боку сусветнай спартыўнай грамадскасці намаганняў і сістэмнай работы беларускай дзяржавы па развіцці спорту і фізічнай культуры», — сказаў ён. Прэзідэнт перакананы, што беларускі глядач здольны па заслугах ацаніць майстэрства ўдзельнікаў турніру. А госці змогуць пераканацца не толькі ў традыцыйнай гасціннасці і добразычлівасці нашага народа, але і ў тым, што ў Беларусі ад малога да вялікага любяць спорт.

«Паняцце, што быць здаровым прэстыжна, актыўна і ўсвядомлена ўваходзіць у жыццё нашых людзей. У Беларусі ствараюцца адпаведныя ўмовы для гэтага. Інтэлектуальна, духоўна і фізічна дасканалая нацыя з'яўляецца галоўным багаццем краіны. Не выпадкова сённяшні турнір прымеркаваны таксама да Года здароўя ў Рэспубліцы Беларусь», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён нагадаў, што праводзімы штогод у нашай краіне Калядны міжнародны турнір на прызы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзякуючы сваёй масавасці і папулярнасці атрымаў статус неафіцыйнага чэмпіянату свету сярод аматарскіх, ветэранскіх хакейных каманд. Ідэя правядзення гэтых унікальных спаборніцтваў знайшла водгук у сапраўдных аматараў хакея і прываблівае ўсё больш прыхільнікаў.

Прэзідэнт пажадаў усім гледачам радасных эмоцый і добрага настрою, а ўдзельнікам турніру — азартнай і рэзультатыўнай гульні.

Каманда Прэзідэнта Беларусі з перамогі стартавала на міжнародным аматарскім турніры па хакеі, які праходзіць у Мінску ў рамках Фестывалю хакея. У першым паядынку беларуская дружына ўзяла верх над зборнай Міжнароднай федэрацыі хакея (IIHF) — 12:9.

Лепшым снайперам у складзе гаспадароў стаў былы форвард нацыянальнай зборнай Беларусі Андрэй Кавалёў, які закінуў тры шайбы. На рахунку кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі адзін гол і тры рэзультатыўныя перадачы.

У складзе гасцей самым рэзультатыўным быў Караліс Шлікас, які закінуў тры шайбы і зрабіў два галявыя пасы, а лепшым іграком у камандзе IIHF прызнаны Вітаўтас Шлікас. У камандзе Прэзідэнта Беларусі лепшым названы яе капітан Андрэй Асташэвіч. Прызы лаўрэатам уручыў вядомы савецкі і расійскі трэнер Уладзімір Юрзінаў-старэйшы.

Характэрна, што вароты дружыны Міжнароднай федэрацыі хакея, сфарміраванай на аснове работнікаў нацыянальных федэрацый Германіі, Швецыі, Славеніі, Літвы, Кітая, Эстоніі і Беларусі, абараняў вядомы амерыканскі рэжысёр Бобі Фарэлі, які зняў такія галівудскія хіты, як «Усе ў захапленні ад Мэры», «Тупы і яшчэ тупейшы», «Дзяўчына маіх кашмараў». А ў нападзенні зборнай IIHF гуляў галоўны трэнер мінскага «Дынама» паўночнаамерыканец Джым Х'юз.

Каманда Прэзідэнта гуляла амаль у аптымальным складзе. Яе колеры абаранялі нядаўнія хакеісты нацыянальнай зборнай Беларусі Уладзімір Цыплакоў, Андрэй Кавалёў, Алег Раманаў, Алег Хмыль, Аляксандр Андрыеўскі, Вадзім Бекбулатаў, а таксама настаўнік мінскага «Юнацтва» Міхаіл Захараў.

У паядынку групы «В» каманда Аўстрыі ўзяла верх над Латвіяй — 7:5, а Германія і Славенія згулялі ўнічыю — 6:6.

Вечарам каманда Прэзідэнта Беларусі ў мінскім Палацы спорту сустракалася са зборнай Расіі.

Арганізатарамі Фестывалю хакея выступілі Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь, Мінскі, Бабруйскі і Жлобінскі гарадскія выканаўчыя камітэты, Федэрацыя хакея Беларусі і рэспубліканскае дзяржаўна-грамадскае аб'яднанне «Прэзідэнцкі спартыўны клуб».

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

Працяг еўрапейскай сенсацыі!

# Футбалісты БАТЭ атрымаюць мільён еўра прэміяльных, а ігракоў "Леўскі" аштрафуюць

Пазаўчора барысаўскі БАТЭ згуляў унічыю (1:1) з балгарскім «Леўскі» ў матчы ў адказ трэцяга кваліфікацыйнага раўнда Лігі чэмпіёнаў і па суме двух матчаў выйшаў у групавы этап турніру. Амаль усю ноч гулялі балельшчыкі ў Барысаве, святкуючы першы ў гісторыі беларускага футбола выхад у асноўную частку самага прэстыжнага еўрапейскага спаборніцтва. Не ўсе змаглі ўжывую стаць сведкамі трыумфу барысаўскай каманды — у продаж паступіла толькі частка білетаў, астатнія былі размеркаваны па прадпрыемствах горада. Перад матчам з рук білет можна было набыць за 30 тысяч рублёў (у касах яны каштавалі па 10 тысяч). Пасля матча балельшчыкі высыпалі на вуліцы Барысава, які быў запоўнены машынамі. З вокнаў і люкаў аўтамабіляў тырчалі сцягі і шалі клубных колераў, пад акампанемент клаксонаў раздавалася «БАТЭ — лепшы!» Каля тысячы балельшчыкаў сабралася на плошчы горада: узрывы петардаў, скандзіраванні «Наперад, Барысаў!» і «БАТЭ — чэмпіён!», хтосьці прапанoўваў на цэнтральнай плошчы паставіць помнік кіраўніку клуба А. Капскаму, а супрацоўнікі міліцыі былі як ніколі паблажлівымі...



Віншаванні ад балельшчыкаў прымае Максім Жаўнерчык.



Фота Пятра ФАМІНА.

Пасля матча галоўны трэнер барысаўчан агучыў інфармацыю, што за поспех футбалісты БАТЭ атрымаюць прэміяльныя ў памеры аднаго мільёна еўра, усяго ж за выхад у асноўны этап Лігі чэмпіёнаў ад УЕФА клуб атрымае 7 мільёнаў еўра. У той жа час уладальнік футбольнага клуба «Леўскі» Тодар Баткаў мае намер аштрафаваць сваіх ігракоў за паражэнне ад барысаўскай каманды ў трэцім раўндзе. Аб сваім рашэнні Баткаў аб'явіў балельшчыкам «Леўскі» ў мінскім аэрапорце. Ён і спартыўны дырэктар «Леўскі» Даніэл Барыміраў папрасілі ў балельшчыкаў прабачэння за тое, што ігракі каманды не падзякавалі іх на стадыёне пасля заканчэння сустрэчы. Раззлаваныя фанаты, якія заплацілі па 550 еўра за паездку ў Беларусь, патрабавалі растлумачыць «ганебнае паражэнне» ад БАТЭ. Тодар Баткаў заявіў, што за слабае выступленне аштрафуе кожнага іграка ў памеры месячнай зарплаты, адзначыўшы, што футбалісты страцілі нашмат больш ад непападання ў групавы этап Лігі чэмпіёнаў.

У той жа час галоўны трэнер «Леўскі» Эміл Велеў на пасляматчавай прэс-канферэнцыі растлумачыў паражэнне свайго клуба: «Галоўная прычына — мала ўдараў па варотах БАТЭ. Самі ж прапусцілі гол ідэнтычны сафійскаму, са стандарту. Мы гулялі стопрацэнтна лепш за БАТЭ, шмат валодалі мячом, камбінавалі. Барысаўчанам будзе цяжка ў групавым раўндзе турніру.» На пытанне наконт нарачканняў на дзеянні арбітра на карысць балгарскага клуба Эміл Велеў адказаў, што не будзе каментаваць гэты аспект і не здагадваецца, якія прэтэнзіі могуць быць у гаспадароў.

Віктар Ганчарэнка прызнаўся, што пра будучае ў Лізе чэмпіёнаў яшчэ не думаў. Галоўны трэнер БАТЭ хацеў бы згуляць з грандамі ўзроўню «Манчэстэр Юнайтэд» і «Барселоны», каб цалкам адчуць атмасферу Лігі чэмпіёнаў. Анатоль Капскі пасля матча расказаў, што на маладога варатара Аляксандра Гутара перад паядынкам аказваўся вялікі ціск з боку балельшчыкаў і прэсы і растлумачыў: «Калі мы вызначаліся з варатарамі на сезон, улічвалі пераход Панкратава і набыццё самага моцнага варатара краіны Верамко. Другім варатарам мы вызначылі Гутара, бо ён шмат працуе і заўважна прагрэсуе. Не хачу пакрыўдзіць іншых беларускіх галкіпераў, але хто мог бы замяніць Верамко ў дадзенай сітуацыі? Ні Саша Суліма, ні Паша Часноўскі не захацелі б дзяліць з ім пост нумар адзін».

Цяпер канчаткова вызначыўся поўны склад удзельнікаў групавога этапа Лігі чэмпіёнаў. 16 камандаў атрымалі аўтаматычныя пуцёўкі ў асноўную сетку турніру, а яшчэ 16 пераадолелі бар'ер трэцяга адборачнага раўнда. На групавым этапе Лігі дэбютуюць уладальнік Кубка УЕФА «Зеніт», румынскі ЧФР, а БАТЭ з кіпрскім «Анартосісам» увогуле сталі першымі прадстаўнікамі адпаведна Беларусі і Кіпра на гэтай стадыі турніру. У выніку на жараб'ёўцы групавога этапа будуць прадстаўлены адразу 17 краін. Усе 32 удзельнікі падзелены на чатыры карзіны, па восем камандаў у кожнай. На групавым этапе клубы з адной краіны не могуць трапіць у адзін квартэт. У першую карзіну трапілі ўсе чатыры прадстаўнікі Англіі — дзеючы чэмпіён «Манчэстэр Юнайтэд», «Чэлсі», які саступіў яму ў фінале, а таксама «Ліверпуль» з «Арсеналам». Тут жа аказаліся «Барселона», «Ліён», «Інтэр» і мадрыдскі «Рэал». У другой карзіне — два прадстаўнікі Германіі («Вердэр» і «Баварыя»), а таксама «Порту» і «Ювентус». У трэцюю карзіну трапілі «Зеніт», «Алімпік», «Сцяўа», «Селтык» і «Фенербахчэ». Нарэшце, у чацвёртай карзіне аказаліся «Атлетыка», «Фіярынціна», а таксама БАТЭ і «Анартосіс», якія пачалі барацьбу ў турніры з першага раўнда. Першы тур групавога этапа адбудзецца 16—17 верасня.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## Дзевяноста шматдзетных жанчын Беларусі ўзнагароджаны ордэнам Маці

За нараджэнне і выхаванне пяці і больш дзяцей Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў 90 шматдзетных жанчын рэспублікі ордэнам Маці. Адпаведны ўказ кіраўнік дзяржавы падпісаў 26 жніўня. Сярод удастоеных гэтай узнагароды, у прыватнасці, работніцы ААТ «Дываны Брэста» Алена Сахарчук і Святлана Іванова, кандытар Шаркоўшчынскага райспажыўсаюза Людміла Трафімава, рэжысёр Петрыкаўскага раённага Дома культуры Людміла Собалева, работніца Ваўкавыскага раённага вузла электрасувязі Марына Зарэцкая, хатняя гаспадыня з Бабруйска Галіна Мельнікава, работніца мінскай сярэдняй агульнаадукацыйнай школы № 172 Ала Жураўлёва.

## Прэзідэнт Беларусі заснаваў геральдычны знак — эмблему фінансавых органаў і нагрудны знак Мінфіна

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сваім указам заснаваў геральдычны знак — эмблему фінансавых органаў Беларусі, а таксама нагрудны знак Міністэрства фінансаў «Выдатнік фінансавай сістэмы». Дакументам таксама зацверджаны палажэнне аб эмблеме, яе апісанне і відарыс, палажэнне аб нагрудным знаку і яго апісанне.**

Нагрудным знакам будуць узнагароджвацца работнікі фінансавых органаў, якія ўнеслі значны асабісты ўклад у развіццё і ўдасканаленне дзейнасці гэтых органаў, якія дасягнулі высокіх вынікаў у працы, узорна выконваюць службовыя абавязкі і адпрацавалі ў фінансавых органах не менш як 5 гадоў, а таксама іншыя асобы за заслугі ў развіцці фінансавай сістэмы Беларусі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## З 1 верасня зменіцца графік руху паяздоў у метро

Інтэрвалы руху скароцяцца. На станцыі першай лініі метро ў будні ў ранішнія часы пік — з 7 да 9 гадзін — паязды будуць хадзіць кожныя дзве хвіліны, у вячэрні час пік — з 16 да 18 гадзін — кожныя 2,5 хвіліны. Па другой лініі метро ў ранішні час пік паязды будуць хадзіць з інтэрвалам 2,5 хвіліны, а з 15 да 19 гадзін — 3 хвіліны.

**Магда КРЭПАК, «Мінск—Навіны».**

## Падзенне курсу еўра да беларускага рубля — часовая з'ява

Падзенне курсу еўра да беларускага рубля — часовая з'ява, і гэта ніяк не паўплывае на развіццё эканомікі краіны. Такую думку выказаў у гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА **дэкан эканамічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта прафесар Міхаіл КАВАЛЁЎ,** каментуючы сітуацыю, што склалася на валютным рынку Беларусі.

Ён адзначыў, што «з наступнага года беларускі рубель будзе знаходзіцца ў калідоры паміж доларам, еўра і расійскім рублём». Таму на невялікіх адрэзках часу еўра можа і крыху падаць, і павялічвацца, прагназуе вучоны. Але паколькі калідор ваганняў курсу ўстаноўлены Нацыянальным банкам на 2009 год невялікі — плюс-мінус 5 працэнтаў, — «то гэта дробныя, нязначныя ваганні». Таму грамадзяне, якія захоўваюць свае зберажэнні ў трох-чатырох валютах, калі ў адной страчваюць, то ў іншай выйграюць. Такім чынам, у сярэднім атрымліваецца, што на дэпазітах можна зарабіць 11—12 працэнтаў — такія працэнты па ўкладах у сярэднім даюць сёння банкі, адзначыў Міхаіл Кавалёў.

«Але калі насельніцтва будзе арыентавацца толькі на адну валюту, то можа ўсе гэтыя працэнты і прайграць за год. Сёння гэта відавочна: зберажэнні трэба дыверсіфікаваць і захоўваць у некалькіх валютах, кіруючыся прымаўкай не класці ўсе яйкі ў адзін кошык», — сказаў эксперт.

Што ж датычыцца курсу долара да еўра, то ён будзе падаць прыкладна да снежня, лічыць субяседнік. «Затым часова ўмацуецца, але, лічу, ненадоўга. Я ўжо з 2000 года гавару, што долар пераацэнены, і яго сапраўдная цана — 2 долары за еўра. Лічу, што гады праз тры так і будзе», — падкрэсліў вучоны.

На беларускую эканоміку гэта таксама ніяк не паўплывае, паколькі «мы прывыклі ўжо арыентавацца не толькі на долар і на еўра». А вось грамадзяне, якія яшчэ моцна давяраюць долару, могуць і страціць. Таму, раіць эканаміст, у каго зберажэнні ў доларах, «іх трэба пацішу падзяліць на некалькі, на гэты момант, можна сказаць, роўных частак». І захоўваць зберажэнні ў еўра, доларах, беларускіх і расійскіх рублях.

Акрамя таго, найбольш выгаднае ўкладанне сродкаў — золата. Беларускае насельніцтва ўжо скупіла некалькі тон золата і так захоўвае свае зберажэнні. «Сапраўды, золата даражэе, калі падае долар. Цяпер золата якраз даражэе і знаходзіцца недзе ў калідоры ад $900 да $1 тыс. за унцыю. Нагадаю, што гадоў 30 таму унцыя золата каштавала $35», — пракаментаваў вучоны.

ISSN 1990 - 763X

**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.08.2008 г.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 111,00 | 1 украінская грыўня | 454,71 |
| 1 еўра | 3 117,10 | 1 расійскі рубель | 86,00 |
| 1 польскі злоты | 930,80 | 1 фунт стэрлінгаў | 3 876,75 |
| 1 латвійскі лат | 4 431,62 | 1 шведская крона | 330,76 |
| 1 літоўскі літ | 902,73 | 1 швейцарскі франк | 1 931,82 |

## Паштовыя маркі серыі «Дзяржаўныя ўзнагароды Рэспублікі Беларусь»

28 жніўня 2008 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь увяло ў паштовае абарачэнне мастацкія паштовыя маркі серыі «Дзяржаўныя ўзнагароды Рэспублікі Беларусь», падрыхтаваныя ВЦ «Марка» РУП «Белпошта».

Дызайнеры Іван Лукін і Алег Гайко.





## У Беларусі будзе створаны цэнтр інфармавання насельніцтва аб будаўніцтве АЭС

У бліжэйшы час у Беларусі будзе створаны інфармацыйны цэнтр, дзе грамадзяне змогуць атрымаць вычарпальную інфармацыю па будаўніцтве ў краіне АЭС. Аб гэтым паведаміў журналістам памочнік Прэзідэнта Беларусі Усевалад Янчэўскі. Акрамя таго, будзе створаны аналагічны інтэрнэт-рэсурс, на якім можна будзе атрымаць не проста даведачную інфармацыю, але і адказы на ўсе пытанні, якія ўзнікаюць у грамадзян Беларусі ў сувязі з будаўніцтвам атамнай станцыі.

«Мы збіраем усе пытанні, якія так або інакш хвалююць грамадзян, усе сумненні, усе няяснасці. І на кожнае з гэтых пытанняў будзе дадзены абсалютна ясны, зразумелы і пераканаўчы адказ», — падкрэсліў Усевалад Янчэўскі. Памочнік Прэзідэнта спаслаўся на вопыт іншых краін, дзе ёсць структуры, у якіх любы грамадзянін можа атрымаць інфармацыю па будаўніцтве і эксплуатацыі атамных станцый.

**БЕЛТА.**

Ліст у нумар

## СПОРТ І РОДНАЕ СЛОВА

Адшумелі Алімпійскія гульні ў Пекіне. Ганаруся поспехамі нашых спартсменаў! Ім не сорамна вяртацца дамоў. Асабліва — ураджэнцам маёй Магілёўшчыны, якія паклалі ў скарбонку краіны першае золата. Слоў няма — малайцы! Але ж, як на мой погляд, медалёў магло б быць болей, калі б...

У студэнцкія гады ў спартыўным таварыстве «Навука» я быў чэмпіёнам Беларусі па бегу на 800 і 1500 метраў, так што ведаю кошт перамог. І помню, як жа хацелася ў апошнія, у вырашальныя хвіліны пачуць (альбо ўспомніць) нейкае гаючае роднае слова, добрую музыку, песню. Гэта — вельмі натхняла, мабілізоўвала, гэта заўсёды прыбаўляла сілаў.

На вялікі жаль — і як мне здаецца — гэты рэзерв у нас пакуль не задзейнічаны. Спартсмены, як і абсалютная большасць іншага люду, адарваны ад сваёй мовы, ад сваёй культуры...

Аднак наперадзе многа новых спаборніцтваў, у іх — ну хочацца верыць — наш сінявокі край заўсёды будзе наймацнейшым. І заваёўваць новыя медалі нам дапаможа веданне героіка-драматычнай гісторыі Беларусі, яе традыцый, песень і вершаў.

**Усевалад ШЫКУНОЎ,**
**дацэнт, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны,**
*г. Магілёў.*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### 22 АХВЯРЫ «ГУСТАВА»



**Ахвярамі трапічнага ўрагану «Густаў» сталі 22 жыхары вострава Гаіці. Цяпер сіла знізілася, ён зноў ператварыўся з урагану ў шторм і працягвае рухацца ў накірунку Ямайкі і Кубы.**

Ва ўсходняй частцы Кубы з зоны рызыкі ўжо эвакуяваныя 50 тысяч чалавек. Хуткасць ветру ў зоне шторму дасягае прыкладна 21 метра ў секунду, а калі ўраган ударыў па Гаіці, хуткасць ветру набліжалася да 40 метраў. У Рэспубліцы Гаіці загінулі 14 чалавек, яшчэ сямёра былі параненыя. Вецер зрываў дахі з хат і вырываў з зямлі слупы ліній электраперадач. У Дамініканскай Рэспубліцы — другой дзяржаве вострава Гаіці, восем чалавек загінулі з-за выкліканага ўраганам гразевага апоўзня.

### ЕС НАКЛАДЗЕ САНКЦЫІ НА РАСІЮ?

**Еўрасаюз збіраецца накласці санкцыі на Расію з-за канфлікту з Грузіяй. Аб гэтым заявіў Бернар Кушнер, міністр замежных спраў Францыі, якая ў цяперашні час з'яўляецца старшынёй ЕС.**

Па словах Кушнера, Еўрасаюз таксама плануе і «шматлікія іншыя дзеянні» ў дачыненні да Расіі. Якія менавіта, ён не ўдакладніў.

Аб тым, якія дзеянні ЕС распачне ў сувязі з сітуацыяй на Каўказе, стане вядома ў панядзелак, 1 верасня. У гэты дзень адбудзецца пазачарговы саміт Еўрасаюза, прысвечаны канфлікту паміж Расіяй і Грузіяй.

Прапанова Польшчы і краін Балтыі запрасіць прэзідэнта Грузіі Міхаіла Саакашвілі на саміт была заблакаваная Францыяй. Іншых паведамленняў аб тым, што Саакашвілі не паедзе ў Брусэль не па сваёй ініцыятыве, не паступала. Грузінскі лідар заявіў, што пакуль не будзе выязджаць за межы краіны, паколькі асцерагаецца, што Расія не дазволіць яму вярнуцца назад. Менавіта таму, растлумачыў ён, пазачарговы саміт ЕС пройдзе без яго ўдзелу.

### У ПАКІСТАНЕ ЗАГІНУЛІ 11 ЧАЛАВЕК

**У выніку тэракту паблізу пакістанскага горада Бану, недалёка ад афганскай мяжы, 28 жніўня загінулі дзевяць паліцэйскіх і двое прахожых. У бальніцу горада Бану былі дастаўлены 12 параненых.**

Начынены выбухоўкай аўтамабіль пратараніў паліцэйскі аўтобус, які ехаў за партыяй зняволеных. Па сцвярджэнні намесніка начальніка паліцыі акругі, зарад быў узарваны пры дапамозе дыстанцыйнага прыстасавання. У жніўні ў Пакістане была ўчынена вялікая колькасць тэрактаў, адказнасць за якія ўзяў на сябе рух «Талібан», прадстаўнікі якога заявілі, што тэракты будуць працягвацца да той пары, пакуль урад Пакістана не спыніць аперацыі па барацьбе з талібамі на паўночным усходзе краіны.

### КАНАДСКІЯ СЕКТАНТЫ МАСАВА ЗАХВАРЭЛІ СВІНКАЙ

**Буйная ўспышка свінкі зафіксаваная ў канадскім горадзе Чыліўёк. Большасць выпадкаў захворвання прыходзіцца на прадстаўнікоў ізаляванай рэлігійнай абшчыны, якая не прызнае прышчэпкі па рэлігійных меркаваннях.**

З лютага 2008 года ў Чыліўёку выяўлена каля 200 выпадкаў заражэння свінкай, тады калі на працягу апошніх гадоў колькасць захворванняў у горадзе і яго наваколлях не перавышала дзесяці. Як мяркуецца, крыніцай інфекцыі стаў жыхар суседняга горада. Першыя выпадкі заражэння былі выяўленыя ў закрытай рэлігійнай абшчыне, члены якой лічаць, што вакцынацыя супярэчыць біблейскім канонам. Цяпер колькасць хворых працягвае хутка павялічвацца, рост захворвання таксама адзначаны ў прылеглых рэгіёнах. У шматлікіх пацыентаў захворванне працякае з цяжкімі ўскладненнямі.

## На прыродаахоўныя мерапрыемствы ў 2008 годзе накіравана дадаткова Br38,4 млрд

**Гэта сродкі, якія паступілі ў фонд аховы прыроды ў выніку перавышэння планавай сумы даходаў фонду за 2007 год, а таксама сродкі фонду, не выкарыстаныя ў мінулым годзе. Аляксандр Лукашэнка 26 жніўня падпісаў указ № 447, які размяркоўвае сродкі фонду.**

Частка сродкаў пойдзе на выкананне мерапрыемстваў па скарачэнні выкідаў шкодных рэчываў у атмасферу прамысловымі прадпрыемствамі гарадоў Полацка і Наваполацка, распрацоўку планаў кіравання Нацыянальным паркам «Белавежская пушча» і Бярэзінскім біясферным запаведнікам, завяршэнне работ на заводзе па вытворчасці газетнай паперы з лесапільнай вытворчасцю ў Шклове, добраўпарадкаванне тэрыторый населеных пунктаў, ахову і рацыянальнае выкарыстанне зямель, а таксама іншыя прыродаахоўныя мерапрыемствы, у тым ліку запланаваныя Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмай на 2008 год.

## Міністэрства статыстыкі і аналізу Беларусі пераўтвараецца ў Нацыянальны статыстычны камітэт

**Міністэрства статыстыкі і аналізу Беларусі пераўтвараецца ў Нацыянальны статыстычны камітэт — рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання, падпарадкаваны непасрэдна Прэзідэнту. Адпаведны Указ № 445 кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў 26 жніўня, паведамілі ў прэсслужбе беларускага лідара.**

Гэтым рашэннем орган дзяржаўнай статыстыкі краіны вызваляецца з падпарадкавання ўрада і становіцца поўнасцю незалежным у сваёй прафесійнай дзейнасці, як гэтага патрабуе прыняты ў 2005 годзе Еўрапейскі кодэкс статыстычнай практыкі.

Са змяненнем статусу органаў дзяржаўнай статыстыкі іх задачы, функцыі, правы і абавязкі не мяняюцца.

Разам з тым практычная рэалізацыя прынцыпу прафесійнай незалежнасці дасць магчымасць павысіць давер да афіцыйнай статыстыкі і ўпэўненасць карыстальнікаў у атрыманні незалежнай і аб'ектыўнай інфармацыі аб сацыяльна-эканамічным развіцці рэспублікі, рэгіёнаў і галін эканомікі.

Указ уступае ў сілу праз месяц пасля яго афіцыйнага апублікавання, за выключэннем некаторых пунктаў.

## У Беларусі вызначаны выпадкі, калі конкурс на права ажыццяўлення аўтаперавозак пасажыраў не праводзіцца

Адпаведны ўказ № 444 «Аб некаторых пытаннях правядзення конкурсаў на права выканання аўтамабільных перавозак пасажыраў у рэгулярных зносінах» Прэзідэнт Беларусі падпісаў 26 жніўня. У сувязі з тым, што Беларусь пры арганізацыі і выкананні міжнародных аўтамабільных перавозак пасажыраў у рэгулярных зносінах кіруецца міжнароднымі дагаворамі і пагадненнямі, якія не прадугледжваюць правядзенне конкурсу, права на выкананне такіх перавозак будзе прадастаўляцца без конкурсу...

**Паводле паведамленняў Прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

## Міністэрства аховы здароўя не адмаўляецца да сістэмы талонаў

**Аб гэтым заявіў міністр аховы здароўя Беларусі Васіль Жарко ўчора ў час online канферэнцыі на сайце Беларускага тэлеграфнага агенцтва.**

Міністэрства аховы здароўя Беларусі прапануе павялічыць тэрмін работы выпускнікоў медыцынскіх ВНУ па месцы абавязковага размеркавання. Аб тым, колькі гадоў будуць абавязаны адпрацаваць па размеркаванню маладыя медыкі, пяць ці больш, гаварыць яшчэ рана, адзначыў Васіль Жарко.

## Тры пляцоўкі для будаўніцтва АЭС прызнаны экспертамі МАГАТЭ прыдатнымі

Жыццёвы цыкл кожнай атамнай станцыі ўключае тры этапы: будаўніцтва, эксплуатацыю і зняцце з эксплуатацыі. Наша краіна знаходзіцца пакуль на папярэднім этапе — выбары пляцоўкі для будаўніцтва ўласнай АЭС. Паводле патрабаванняў МАГАТЭ, краіна павінна мець некалькі альтэрнатыўных пляцовак. Як паведаміў на прэс-канферэнцыі акадэмік НАН Беларусі, намеснік акадэміка-сакратара Аддзялення фізіка-тэхнічных навук НАН Беларусі Аляксандр Міхалевіч, місія экспертаў МАГАТЭ месяц таму наведала Беларусь і вывучыўшы даныя аб даследаваннях Краснапольскай, Кукшынаўскай і Астравецкай пляцовак, прызнала іх прыдатнымі для будаўніцтва.

На этапе выбару пляцоўкі праводзяцца ў тым ліку і экалагічныя даследаванні магчымых рэгіёнаў, дзе будзе ўзведзена атамная станцыя, паведаміў прадстаўнік ДУ «Дырэкцыя будаўніцтва атамнай электрастанцыі Уладзімір Петрушкевіч. Квоты па выкідах у навакольнае асяроддзе рэгулююцца нарматыўнымі дакументамі, і гэтымі лічбамі кіруюцца праекціроўшчыкі АЭС. Згодна з законам аб радыяцыйнай бяспецы, ад усіх відаў тэхнагеннага апраменьвання, уключаючы атамныя станцыі, доза апраменьвання не павінна перавышаць 1,0 мЗв у год. А пры праектаванні атамных станцый нарматыўнымі дакументамі ўстанаўліваецца квота выпраменьвання ад атамнай станцыі, якая складае 100 мкЗв у год, або 10 працэнтаў ад усіх тэхнагенных крыніц. Для разліку дапушчальных выкідаў з улікам рэальных умоў працы станцыі і ўдасканалення тэхналогій бярэцца лічба яшчэ ў дзесяць разоў меншая. Як расказаў Уладзімір Петрушкевіч, фактычныя даныя па рабоце атамных станцый не з'яўляюцца сакрэтам. Штогод федэральная служба па экалагічным і атамным наглядзе Расійскай Федэрацыі публікуе даныя аб усіх атамных станцыях Расіі па колькасці выкідаў і скідаў, якія, дарэчы, можна знайсці ў інтэрнэце. І паводле гэтых даных можна зрабіць выснову, што рэальныя значэнні выкідаў яшчэ значна меншыя, чым мінімальна ўстаноўленыя. Так, напрыклад, выкіды інертнага радыеактыўнага газу складаюць ад 16 да 0,02 працэнта ад крайніх дапушчальных.

Як паведаміла дырэктар Дэпартамента па гідраметэаралогіі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Марыя Герменчук, тры магчымыя пляцоўкі для будаўніцтва АЭС вывучаюцца з пункту гледжання экалагічнай бяспекі (геалагічнай будовы і экалагічнага складніка на сёння). Наша краіна мае вялікі вопыт у вывучэнні ўздзеяння ядзернай энергетыкі на навакольнае асяроддзе. Вывучэнне пачалося яшчэ ў васьмідзесятыя гады мінулага стагоддзя, калі ў БССР планавалася будаўніцта цеплавой электрацэнтралі. Гэты вопыт быў удасканалены, дзякуючы сумеснай працы з літоўскім бокам па вывучэнні ўздзеяння на навакольнае асяроддзе магільнікаў ядзернага паліва на Ігналінскай атамнай станцыі. І дзякуючы гэтым напрацоўкам, некаторыя нормы экалагічнай бяспекі ў нашай краіне больш жорсткія, чым у той жа Літве і краінах ЕС. Наша краіна, як ніякая іншая, моцна пацярпела ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, і «мы зрабілі высновы, якія дазваляюць нам упэўнена глядзець у будучыню», — заявіла Марыя Гермянчук. Сёння ў Беларусі сучасная сістэма маніторынгу радыяцыйнага ўзроўню як на забруджаных пасля аварыі на ЧАЭС тэрыторыях, так і на тэрыторыях вакол атамных станцый, якія знаходзяцца паблізу ад нашай мяжы — Ігналінскай, Ровенскай і Смаленскай АЭС. Інфармацыя аб радыяцыйным фоне даступная і знаходзіцца ў інтэрнэце. Абнаўляецца яна кожную гадзіну, у выпадках надзвычайных становішчаў на станцыях — кожныя дзесяць хвілін.

Як паведаміў намеснік дырэктара Дэпартамента па геалогіі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Уладзімір Коркін, тры абраныя для будаўніцтва пляцоўкі дэтальна вывучаны ў геалагічных адносінах з улікам сусветнага вопыту. Даныя гэтых даследаванняў паказваюць, што пляцоўкі знаходзяцца ў дастаткова ўстойлівых геалагічных умовах, геалагічных фактараў, якія забараняюць будаўніцтва, не ўстаноўлена.

**Алена КРАВЕЦ.**

### ЗАБІЎ І ПАВЕСІЎСЯ

У Пастаўскім раёне днём у доме знайшлі труп 49-гадовага беспрацоўнага. Забілі яго сякерай. Высветлілася, што гэта зрабіў знаёмы, таксама беспрацоўны. Да трагедыі выпівалі. Апошні пасля забойства павесіўся ў прысядзібнай забудове дома свайго брата. Пракуратурай узбуджана крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

*Открытое акционерное общество «Борисовбытспецсервис»*

**в дополнение к объявлению, опубликованному в газете «Звязда» от 19.08.2008 г. № 154 (26267), извещает о том, что окончательный срок представления ценовых предложений для участия в процедуре**

**ЗАПРОСА ЦЕНОВЫХ ПРЕДЛОЖЕНИЙ**

по поставке одного парового котла
мощностью кВт кг/час 250—1250; давление бар 16,
температура °С — пар насыщенный,
тип котла — U-HD, конструкция — 2-х ходовый

**ИСТЕКАЕТ 01.09.2008 г.**

***Дополнительную информацию можно получить по адресу: 222525 г. Борисов, ул. имени Братьев Вайнрубов, 7. Тел.: 8 0177 78 70 80. Тел./факс 8 0177 78 79 58.***

# На кожнага настаўніка — 1,1 стаўкі

**1 верасня за школьныя парты сядуць 1 млн 103 тысячы беларускіх школьнікаў, у тым ліку і 93 тысячы першакласнікаў. Гэта амаль на 2 тысячы больш дзяцей, чым у папярэднім годзе. Да 1 верасня будуць здадзеныя ў эксплуатацыю 4 новыя школы, 2 спартыўныя залы ў школах і адна школа вернецца ў строй пасля рэканструкцыі. Праўда, 93 агульнаадукацыйныя ўстановы будуць зачынены і яшчэ 37 — рэарганізаваныя. Аб гэтым паведаміў на калегіі Мінадукацыі, прысвечанай падрыхтоўцы нацыянальнай сістэмы адукацыі да новага навучальнага года, намеснік міністра адукацыі Казімір Фарыно.**

— Аптымізацыя і рэструктурызацыя сеткі навучальных устаноў ажыццяўляецца на месцах прадумана, з улікам рэальнай дэмаграфічнай сітуацыі, — падкрэсліў Казімір Фарыно. — Для арганізацыі падвозу дзяцей сёлета запланавана дадаткова набыць 125 аўтобусаў. Звыш 70 працэнтаў аўтобусаў ва ўстановы адукацыі ўжо паступілі, астатнія — паступяць у бліжэйшы час.

Казімір Фарыно акрэсліў шэраг самых важных задач, якія стаяць перад сістэмай адукацыі ў новым навучальным годзе. У сістэме дашкольнай адукацыі неабходна правесці апераджальны рамонт і рэканструкцыю ўстаноў дашкольнай адукацыі — на сёння капітальны рамонт патрабуецца 715 дашкольным установам. Сур'ёзную ўвагу трэба надаць сацыяльнай абароне работнікаў і спецыялістаў дашкольных устаноў, каб зменшыць цякучасць кадраў: цяпер у дашкольных установах 1005 вакансій выхавальнікаў, 124 вакансіі медыцынскіх сёстраў і 438 вакансій памочнікаў выхавальніка. «Увогуле, улічваючы, што значная колькасць аб'ектаў адукацыі эксплуатуюцца без капітальнага рамонту дзесяткамі гадоў, мы падтрымліваем пазіцыю Міністэрства фінансаў, аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама па значным павелічэнні аб'ёмаў фінансавання рамонтных работ на аб'ектах адукацыі. У пэўнай ступені такія падыходы замацаваныя і ў праекце бюджэту краіны на 2009 год», — дадаў Казімір Фарыно.

Сур'ёзнае выпрабаванне ў сувязі з пераходам школы на 11-гадовы тэрмін навучання чакае сістэму агульнай сярэдняй адукацыі.

— Па ўсіх прадметах вучэбнага плана 11-гадовай школы падрыхтаваны і даведзены да ведама педагагічнай грамадскасці інструктыўна-метадычныя лісты, якія адлюстроўваюць асаблівасці арганізацыі адукацыйнага працэсу, выкарыстанне падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, сродкаў навучання і парадак ацэньвання вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, — паведаміў Казімір Фарыно. — Падрыхтаваны ўсе неабходныя нарматыўныя і метадычныя матэрыялы, аднак іх *паспяховая рэалізацыя будзе залежаць ад кампетэнтнасці кожнага канкрэтнага настаўніка і яго прафесіяналізму.* Былі ўнесены таксама карэкціроўкі ў план і графік выпуску вучэбных выданняў. Кожны школьнік павінен быць забяспечаны да пачатку навучальнага года камплектам падручнікаў. Мяркую, што для гэтага трэба ўзяць пад асаблівы кантроль выкарыстанне ў вучэбным працэсе ўсіх падручнікаў і вучэбна-метадычнай літаратуры, выдадзенай у папярэднія гады.

Па ацэнках Мінадукацыі, сярэдняя педагагічная нагрузка ў агульнаадукацыйных установах краіны ў новым навучальным годзе складзе 1,1 стаўкі. *Скарачэнне настаўнікаў, як запэўніў Казімір Фарыно, не адбылося.* Да таго ж ва ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі было накіравана па размеркаванні 5,4 тысячы маладых спецыялістаў.

Але праблемы з кадрамі ў галіне ўсё ж такі ёсць. Так, ва ўстановах прафтэхадукацыі не хапае выкладчыкаў спецдысцыплін і майстроў вытворчага навучання, якія сыходзяць з нівы педагогікі на вытворчасць, дзе значна больш высокі ўзровень заробкаў і больш важкі сацыяльны пакет. Адчуваецца дэфіцыт кадраў, як ужо гаварылася вышэй, у дашкольных установах, установах пазашкольнага выхавання, а таксама дэфіцыт спецыялістаў карэкцыйнай педагогікі: установам адукацыі патрабуюцца дадаткова яшчэ 233 настаўнікі-дэфектолагі.

— Кадравыя праблемы звязаны ў асноўным з нізкім сацыяльным статусам педагогаў, недастатковым узроўнем заработнай платы і скарачэннем у многіх катэгорый педагагічных работнікаў водпускаў. Кіраўніцтва міністэрства добра разумее гэту праблему і прымае разам з зацікаўленымі бакамі ўсе неабходныя меры для выпраўлення сітуацыі, — запэўніў Казімір Фарыно.

Дарэчы, Міністэрства адукацыі рэкамендавала прысвяціць першы ўрок у Дзень ведаў 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэты ўрок стане лейтматывам святочных мерапрыемстваў (конкурсаў, канцэртаў, выстаў), якія будуць праходзіць ва ўстановах адукацыі на працягу ўсяго навучальнага года...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Гучная справа

## «ЛЕКАВЫ» ПРЫБЫТАК



**За восем гадоў — з 1998-га па 2006-ы — чацвёрка супрацоўнікаў РУП «Белмедпрэпараты» разам з двума памочнікамі пазбавілі вышэйзгаданае прадпрыемства згодна з доказанымі фактамі па ўчыненні ўрону звыш 800 мільёнаў рублёў. Гэта была адна з буйных крымінальных спраў, раскрытых у мінулым годзе. Суд прыгаварыў злачыннае згуртаванне да зняволення тэрмінам ад пяці да дзевяці гадоў.**

Крадзеж грашовых сродкаў рабіўся пад выглядам налічэння аплаты па несапраўдных працоўных пагадненнях і дагаворах падраду з фізічнымі асобамі, у тым ліку пад выглядам выдачы пазачарговых авансаў. Паводле слоў намесніка начальніка Галоўнага следчага ўпраўлення папярэдняга расследавання Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Дзмітрыя ДАНІЛЬЧЫКА, у верасні 2006 года ў аддзел па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю Маскоўскага РУУС г. Мінска паступіла аператыўная інфармацыя аб тым, што службовыя асобы РУП «Белмедпрэпараты» працяглы час заключаюць фіктыўныя працоўныя пагадненні і дагаворы падраду з фізічнымі асобамі Беларусі і Украіны, і такім шляхам крадуць грашовыя сродкі прадпрыемства.

Кіраўнікамі групы былі галоўны бухгалтар РУП «Белмедпрэпараты» Наталля Шусціцкая (усе прозвішчы зменены. — Аўт.) і намеснік генеральнага дырэктара па фінансах і эканоміцы Сяргей Куняўскі. Дапамагалі ім супрацоўніцы завода — кіраўнік групы разлікаў і налічэнняў па заработнай плаце Валянціна Данцова і бухгалтар-касір Ганна Казлова, а таксама Людміла Даўгалёва і Наталля Смеяновіч, якія на прадпрыемстве не працавалі. Шусціцкая і Куняўскі ставілі пад падробленымі дакументамі свае подпісы, рыхтавалі «ліпавыя» плацежныя ведамасці. Данцова налічвала па несапраўдных дакументах узнагароджанні і авансы, Казлова выдавала патрэбныя махінатарам грошы. Даўгалёва і Смеяновіч атрымлівалі ў касе грашовыя сродкі і перадавалі для далейшага размеркавання «босу» — Наталлі Шусціцкай.

Падчас высвятлення абставінаў крадзяжоў Даўгалёва патлумачыла, што атрымлівала грошы за фізічных асобаў, падрабляла у плацежных ведамасцях іх подпісы. Частку грошай пасля перадавала Шусціцкай, а тая, у сваю чаргу, дзялілася з Куняўскім. Данцова налічвала грашовыя ўзнагароджанні па дагаворах падраду з фізічнымі асобамі, і кіравалася пры гэтым вуснымі ўказаннямі «боса» Наталлі, якая сцвярджала, што акты прыёму-перадачы работ і справаздачы да дагавораў маюць быць, а самі работы — выконваюцца. Такім чынам, «шэфіня» загадвала налічваць грашовыя ўзнагароджанні без актаў выкананых работ. Акрамя таго, Данцова двойчы ў месяц налічвала грашовыя ўзнагароджанні на адных і тых жа фізічных асобаў, у рэестры даведак аб даходах не ўключала звесткі аб налічаных грошах па дакументах, якія яна толькі бачыла. Да таго ж, Валянціна Данцова атрымлівала сваю «долю» ў дадатак да ўстаноўленага заробку.

Сяргей Куняўскі не бачыў нічога крымінальнага ў сваіх дзеяннях. Паводле яго слоў, пасада, якую ён займаў, дазваляла яму падпісваць фінансава-гаспадарчыя дакументы. Кантраляваць жа правільнасць расходавання грашовых сродкаў ён не мог, пакольку гэтым займалася спадарыня Шусціцкая. Спасылаўся і на інструкцыю, якая не абавязвала яго ажыццяўляць падобны кантроль. Сцвярджаў, што падпісваў дакументы пасля візы Наталлі, якой давяраў, а аб тым, якім чынам вызначаўся памер ганарараў, не ведаў. Тым не менш, віна Куняўскага была даказана. «Лэдзі-бос» перадавала яму грошы з таго моманту, як апошні пачаў падпісваць фіктыўныя працоўныя дамоўленасці.

Калі аднойчы Куняўскі ад'язджаў у камандзіроўку, Шусціцкая папрасіла непрацуючую на прадпрыемстве Даўгалёву прыехаць і атрымаць грошы для ўсіх, у тым ліку і для Куняўскага, па фіктыўных пагадненнях. Фактычна неабходнасць атрымання сродкаў звязвалася менавіта з гэтым чалавекам. Сяргей падпісваў або візіраваў працоўныя пагадненні падраду з многімі фізічнымі асобамі, якім, быццам бы, даручалася прадстаўляць інтарэсы прадпрыемства ў Расіі ці ва Украіне.

Наогул ініцыятыва заключэння дамоўленасці на прадпрыемстве належыць работніку, які курыруе або ўзначальвае адпаведную структуру. Існуе аддзел працы і заработнай платы, які дакладна можа пралічыць кошт работ. Праўда, служба гэта падпарадкоўвалася Куняўскаму...

На РУП «Белмедпрэпараты» сістэматычна парушаўся парадак выдачы грашовых сродкаў з касы па плацежных ведамасцях. І, як высветлілася ў працэсе расследавання, ніводная з праведзеных аперацый не адпавядала ўстаноўленым патрабаванням. Фактычна спачатку выдаваліся грошы, а потым ведамасці падпісваліся адказнымі работнікамі. Між тым, вядома, што налічэнне заробку па працоўных пагадненнях і дагаворах без актаў прыёму-перадачы недапушчальнае.

— Працэдура заключэння працоўных пагадненняў і дагавораў падрадаў з фізічнымі асобамі рэгламентуецца грамадзянскім заканадаўствам, — удакладняе палкоўнік міліцыі Дзмітрый Данільчык. — Там указаны ўмовы, без якіх дагавор лічыцца несапраўдным. Гаворка ідзе пра дату і месца заключэння, кошт работ, парадак аплаты, адказнасць бакоў за невыкананне сваіх абавязкаў і г.д. У дагаворы падраду павінны быць агавораны ўмовы аплаты заказчыкам падатковых плацяжоў, атрыманне страхавых выплат. У абавязковым парадку ўказваецца аб'ём работ, тэрміны іх выканання, якасць, кошт. Справаздачы не могуць замяніць акты, якія пацвярджаюць фактычнае выкананне... Падчас жа праверкі прадпрыемства было ўстаноўлена, што ні аддзел стандартызацыі і рэгістрацыі, ні камерцыйны цэнтр не выходзілі з ініцыятывай заключэння працоўных пагадненняў і дагавораў падрадаў, якія разглядаліся ў межах гэтай справы. Да таго ж, ініцыятыва заключэння пагадненняў і дагавораў не ўваходзіла ў службовыя абавязкі «кіраўнікоў» злачыннай групы... На прадпрыемстве наўмысна не забяспечвалі захаванне важных дакументаў...

...Паводле ўстаноўленых фактаў, Шусціцкая і Куняўскі скралі кожны больш як па 400 мільёнаў рублёў, Данцова і Казлова — звыш 400 мільёнаў рублёў на дваіх, Даўгалёва — каля 350 мільёнаў і Смеяновіч — звыш 40 мільёнаў.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

### ДА ВЕДАМА

***РУП «Белмедпрэпараты» — буйнейшае фармацэўтычнае прадпрыемства, роданачальнік фармацэўтычнай прамысловасці ў Беларусі. Цяпер яно штогод выпускае да 200 найменняў гатовых лекавых формаў. Больш за палову прадукцыі, што выпускаецца на прадпрыемстве, экспартуецца ў Расію, ва Украіну, у Арменію, Узбекістан. Зараз ідзе рэгістрацыя на рынках Малдовы і Казахстана. Стварэннем новых лекавых сродкаў і распрацоўкай прагрэсіўных тэхналагічных працэсаў займаецца навукова-фармацэўтычны цэнтр завода, буйнейшы спецыялізаваны цэнтр у айчыннай фармацэўтычнай галіне.***

## Рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты парламента завяршаецца 28 жніўня

**Затым пачнецца перыяд агітацыі і прапаганды, паведаміў карэспандэнту БЕЛТА сакратар Цэнтрвыбаркама Беларусі Мікалай Лазавік.**

Дзень выбараў назначаны на 28 верасня. На 110 месцаў у ніжняй палаце беларускага парламента па выніках вылучэння прэтэндуюць 365 суіскальнікаў. Сярод ахвотнікаў стаць народнымі выбраннікамі налічваецца 68 жанчын, 29 грамадзян ва ўзросце да 30 гадоў, 41 чалавек з цяперашніх прэтэндэнтаў ужо быў дэпутатам Палаты прадстаўнікоў. Найбольш жадаючых балатавацца ў беларускі парламент вылучана ў 20 акругах горада Мінска — 103 чалавекі. У выбарчых камісіях Брэсцкай вобласці знаходзяцца дакументы ад 47 заяўнікаў (на 16 акруг), Віцебскай — ад 37 (на 14 акруг), Гомельскай — ад 51 (на 17 акруг), Гродзенскай — ад 34 (на 13 акруг), Магілёўскай — ад 51 (на 13 акруг) і Мінскай — ад 42 (на 17 акруг). З тых, хто мае намер зарэгістравацца, 36 грамадзян — работнікі прамысловасці, транспарту і сувязі, 61 — працуюць у сферы адукацыі, культуры, навукі і аховы здароўя, 4 — у сельскай гаспадарцы, 4 — у гандлі і бытавым абслугоўванні. У спісах таксама 4 прадстаўнікі ваенных і праваахоўных структур, 68 работнікаў дзяржорганаў...

## Царква ў Вялікіх Аўцюках

У гонар Георгія Перамаганосца названа царква, якая будзе ўзведзена ў вёсцы Вялікія Аўцюкі Калінкавіцкага раёна. Тут гэтымі днямі адбылося ўрачыстае асвячэнне падмурка храма, якое зрабіў епіскап Тураўскі і Мазырскі Стэфан.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

### Абзац

■ Сёння — Трэці Спас (Малы Спас, Нерукатворны вобраз, Палатняны Спас, Хлебны, Арэхавы). Праваслаўная царква адзначае ў гэты дзень свята ў гонар перанясення ў Канстанцінопаль Нерукатворнага вобраза Ісуса Хрыста ў 944 годзе. У народзе Палатняным яго называюць таму, што ў гэты дзень адбываліся кірмашы і гандлявалі палатном. У многіх мясцінах у гэты дзень спраўлялі дажынкі, казалі: «Трэці Спас — хлеба прыпас». У гэты дзень ці каля яго сяляне рабілі дасеўкі, г.зн сеялі азімае жыта. Да гэтага дня паспявалі арэхі і пачынаўся іх збор. Адляталі апошнія ластаўкі.

■ **Супрацоўнікі праваахоўных органаў затрымалі ў Германіі жыхара Беларусі, які спрабаваў правезці ў страўніку паўкілаграма какаіну з Венесуэлы. Наркакур'ер-глытальнік, па аператыўнай інфармацыі, хацеў правезці наркотыкі ў Расію. Затрыманы таксама арганізатар правозу — былы грамадзянін Беларусі, які быў дэпартаваны з ЗША.**

■ Малдова прыпыніла пастаўкі ў Беларусь каньяку налівам. Прычыны такога кроку ў Аграпрамысловым агенцтве «Малдова-він» не назвалі. Сёлета за паўгода Малдова паставіла ў Беларусь 23,28 тыс. дэкалітраў каньяку налівам на $2,2 млн. У цэлым пастаўкі малдаўскай алкагольнай прадукцыі ў Беларусь у першым паўгоддзі павялічыліся на 36 працэнтаў у параўнанні з такім жа папярэднім перыядам. Згодна са сцвярджэннем кіраўніцтва «Белхарчпрама», лікёрагарэлачныя прадпрыемствы Беларусі маюць дастатковы запас каньяку, што паступіў з Малдовы налівам па ранейшых дагаворах, і гатовыя забяспечыць рытмічны выпуск гатовай прадукцыі як пад гандлёвымі маркамі малдаўскіх вытворцаў, так і пад уласнымі назвамі. Дарэчы, міністэрства гандлю Беларусі абвяргае інфармацыю аб ажыятажным попыце на імпартныя алкагольныя напіткі.

■ **Згодна са звесткамі Міністэрства аховы здароўя Беларусі, за першае паўгоддзе дыспансэрнае абследаванне прайшлі 61,5 працэнта насельніцтва краіны. З іх практычна здаровымі з'яўляюцца 19,4 працэнта, дынамічнае дыспансэрнае назіранне неабходнае 46,8 працэнта пацыентаў.**

■ Сёлетняе лета стала для Масквы самым дажджлівым за сто гадоў. Па звестках Маскоўскага метэабюро, за тры месяцы тут выпала 366 мм ападкаў.

■ **Тэрміновую пасадку ў аэрапорце Германіі давялося выканаць самалёту ірландскай авіякампаніі Ryanair, які ляцеў рэйсам Будапешт — Дублін. Прычынай інцыдэнту стаў грыбны суп, які праліўся на аднаго з пасажыраў і выклікаў у яго моцную алергію. Суп праліўся са скрыні, якая знаходзілася ў пасажыра над галавой. У мужчыны імгненна пачалася алергічная рэакцыя: распухла шыя, яму стала цяжка дыхаць. Экіпаж не змог дапамагчы пацярпеламу, таму было прынята рашэнне зрабіць незапланаваную пасадку ў бліжэйшым аэрапорце. Boeing 737 прызямліўся ў Франкфурце, дзе пасажыру была аказана экстраная медыцынская дапамога. Праз дзве гадзіны самалёт прадоўжыў свой палёт.**

■ У горадзе Навашахцінску Растоўскай вобласці з вострай інфекцыяй шпіталізаваныя 47 чалавек, сярод іх ёсць і дзеці. Папярэдні дыягназ — інфекцыйны востры гастраэнтэракаліт. Мяркуецца, што крыніцай заражэння стала вада з водаправода. Хворыя працягваюць паступаць у бальніцы.

■ **У Краснадарскім краі мужчына расстраляў з абрэза дзвюх суседак, пасля чаго скончыў жыццё самагубствам. Расправа стала вынікам працяглай зямельнай цяжбы. Суседзі працяглы час спрачаліся аб тым, дзе павінна праходзіць мяжа іх зямельных участкаў. Было некалькі судоў і іх рашэнні прымаліся не на карысць мужчыны.**

### Поўны абзац

■ Міністр аховы здароўя і спорту Францыі Разялін Башло-Наркэ з'явілася на ўчарашнім пасяджэнні ўрада ў пляжных гумавых сандалях ружовага колеру. Такім чынам яна вырашыла адзначыць поспех нацыянальнай зборнай Францыі на Алімпійскіх гульнях. Яшчэ да пачатку спаборніцтваў у Пекіне яна паабяцала абуць каўчуковыя сандалі, калі французы заваююць не менш як 40 медалёў. Менавіта такую колькасць узнагарод абяцалі французам найбольш аптымістычныя прагнозы спартыўных каментатараў. Учора міністр стрымала сваё слова. Пасля заканчэння рабочай сустрэчы ў Елісейскім палацы яна папазіравала перад камерамі журналістаў.

■ **У Алтайскім краі пацярпела 26-гадовая жыхарка Паўлаўскага раёна, якая з дапамогай сяброўкі спрабавала зрабіць фота на памяць аб паездцы на сваю малую радзіму ў Кулунду. У якасці фону для фота дзяўчына выбрала фантан на прывакзальнай плошчы станцыі Кулунда. Яна ўзлезла на другі ярус фантана і, пацягнуўшы на сябе верхнюю частку канструкцыі, з аглушальным грукатам звалілася на зямлю. Да таго, як лезці на фантан, сяброўкі адзначылі прыезд. Як патлумачылі ў міліцыі, бетонная канструкцыя вагой больш за паўтоны і вышынёй 2,5 метра поўнасцю разбураная. Фантан плануюць узнавіць. Акрамя фотаздымка на памяць, дзяўчына атрымала сур'ёзныя разрывы мяккіх тканак рукі да косці. Сума ўрону ўстанаўліваецца.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

Народная энцыклапедыя

# ВЯСЕЛЬНЫ СТОЛ: рытуальныя атрыбуты і традыцыйная ежа

*(Працяг. Пачатак у нумары за 28 жніўня.)*

❒ Каб засцерагчы дзіця ад нячыстай сілы, нядобрых пагляду і сурокаў, пад падушку або ў калыску клалі асвячоную на Тройцу зеляніну — галінку клёну, бярозы, аер.

❒ Каб ноччу прысніўся суджаны, дзяўчаты клалі пад падушку розныя прадметы, напрыклад, грэбень.

❒ Пасля таго, як падзеляць каравай, нявесту садзілі на вялікую падушку. Сімвалізацыя гэтага рытуальнага дзеяння была празрыстай: падушка была як гара, менавіта такой павінна была стаць маладая ў хуткім часе пасля вяселля. Затым на гэтую ж падушку садзілі тых дзяўчат, якія па розных абставінах доўгі час не маглі выйсці замуж.

❒ Пасля вяселля нявеста высушвала букет, які ёй падарыў жаніх, і зашывала ў падушку, «каб сумеснае жыццё было згоднае».

❒ **Пасля першай шлюбнай ночы, як толькі муж устане, жонка хуценька пераварочвала яго падушку, каб усё жыццё «мець над ім уладу».** Тэма лідарства, першынства ў сям'і неаднаразова аказвалася ў цэнтры вясельных рытуалаў, аднак яе абрадавае вырашэнне заўсёды было пазбаўлена адкрытага дэманстравання. Гэта была падводная частка айсберга, якая аказвала прамое ўздзеянне на лёс заручанай пары, але была схавана ад вачэй недасведчанай большасці запрошаных гасцей. **Як толькі маладыя першы раз сядуць за святочны стол, нявеста брала падол сваёй сукенкі і ціхенька, быццам неўпрыкмет, клала на калена жаніха. Гэтым жэстам яна сведчыла: я буду запраўляць сямейнымі справамі.** Аднак калі жаніх ведаў (са слоў сваёй бабулі) тайны сэнс дадзенага рытуалу і не прымаў ніякіх контрдзеянняў, то фактычна на ўсё жыццё даваў згоду на сваё падначаленае становішча.

### І МЁД, І ПІВА...

Як толькі маладыя сядуць на свае месцы, пачыналася доўгачаканае сямейна-родавае застолле, якім з гонарам і пачуццём годнасці кіраваў сват. Ён прасіў наліць чарку гарэлкі, даваў слова для тоста бацькам нявесты, яе шматлікай радзіне, іншым ганаровым гасцям. Гучалі пажаданні, даваліся парады, госці паднімалі кілішак за здароўе і шчасце маладых, іх бацькоў, ўзгадвалі добрым словам тых, хто не дажыў да гэтай шчаслівай хвіліны. Важнай асаблівасцю беларускіх застолляў было тое, што людзі пілі вельмі мала, а вось есці іх у літаральным сэнсе слова прымушалі. Лічылі, што багаты вясельны стол будзе спрыяць дабрабыту наваствoранай сям'і.

Вясельная ўрачыстасць у значнай ступені нагадвала калядна-навагоднія святкаванні. Каляды пачыналі новы гадавы цыкл жыцця, таму яны выконвалі выразна акрэсленую мадэлюючую ролю. Жадаючы, каб на працягу года стол быў сімвалам дабрабыту і дастатку, гаспадыня гатавала дванаццаць розных страў, якія, у сваю чаргу, адлюстроўвалі розныя поры года. Гэты ж прaграмуючы прынцып прадвызначаў і багацце вясельнага стала: якім будзе першае застолле, такім, спадзяваліся, будзе і сямейны дастатак на ўсё жыццё.

### СЯМЕЙНАЯ ТРАПЕЗА

Як і любы іншы складнік беларускага вясельнага рытуальна-абрадавага комплексу (адзенне, атрыбуты, у тым ліку ўпрыгажэнні, дзеянні, чыны, месца), ежа таксама з'яўлялася важнай часткай сямейна-родавых і каляндарных абрадаў і суправаджалася даволі складанай сістэмай сацыяльных нарматываў, а таксама прадпісанняў звычаёвага сялянскага права. Яны ў абавязковым парадку ўлічвалі характар святочных падзей, месца і час правядзення рытуальнай трапезы: паўсядзённай (менавіта так: нават звычайныя паўсядзённыя снеданне, полудзень або вячэра мелі даволі строгі, рэгламетаваны характар), сямейнай або святочнай, сярод прадстаўнікоў свайго роду, у хаце, у полі, на могілках, на жніве. Напрыклад, больш строгімі былі правілы паводзінаў, якія датычыліся абеду і вячэры, больш дэмакратычнымі — снедання і калі палуднавалі.

Сакральнае стаўленне да ежы абапіраліся як на павагу да цяжкай і шматэтапнай працы па ўзгадаванні ўраджаю і працэсу прыгатавання, так і на само месца харчавання сям'і. Сямейная трапеза — гэта не проста акт фізічнага сілкавання чалавека дзеля падтрымання працаздольнасці, фізічнага стану, але адначасова і акт духоўнага выхавання асобы. Паўсядзённая сямейная трапеза — гэта квінтэсенцыя ўсяго комплексу сямейных узаемаадносінаў. Застолле — гэта галоўная старонка сялянскага дамастрою, на якой, як на далоні, выразна чытаюцца ўсе сілавыя лініі сацыяльных, статусных, полаўзроставых адносінаў паміж дарослымі членамі сям'і і дзецьмі. Акрамя таго, у хаце знаходзіўся абраз, а гаспадар займаў месца пад ім і павінен быў арганізаваць трапезу так, каб да «дароў, што зыходзяць ад Бога», былі адпаведныя адносіны: павага і ўдзячнасць.

Перад ядой усе абавязкова мылі рукі. Зноў-такі гэта працэдура была не толькі патрабаваннем асабістай гігіены, але і актам рытуальнага ачышчэння рук, якія будуць дакранацца да «святых дароў». Калі сям'я была на жніве і палуднавала ў полі, то рукі выціралі аб зямлю. Лічылася, зямля валодае той жа ачышчальнай функцыяй, што і вада.

**Ніколі не елі на стале, не пакрытым абрусам або настольнікам.** «Боская» далоня заўсёды павінна быць накрытай. У паўсядзённым жыцці і ў святочныя дні абрус клалі на стол правым («добрым») бокам, а вось на жалобныя сталы — левым, тым самым паказваючы выключнасць падзеі або выключанасць сям'і з кола агульнародавых урачыстасцяў.

Першым за стол садзіўся гаспадар, а затым астатнія члены сям'і, прычым у адпаведнасці з узростам. Ён жа першым і заканчваў трапезу. Гаспадар першым каштаваў пададзеныя стравы, строга сачыў за парадкам, справядліва дзяліў ежу паміж дамачадцамі.

Сямейны стол знаходзіўся ў чырвоным куце хаты, у якім знаходзіўся сноп-«дзед», дзяжа, абразы — усё гэта і прадвызначала характар паводзінаў людзей у час трапезы. Народны этыкет прадпісваў есці моўчкі, спакойна, няспешліва. Калі і заходзіла якая-небудзь гаворка, то толькі аб галоўных гаспадарчых справах. Асабліва строга ставіліся да забаронаў размаўляць за сталом пасля захаду сонца. Той, хто еў хутка, мог атрымаць заўвагу. Нязграбнасць, рассыпаныя крошкі, непаседлівасць лічыліся вялікімі грахамі.

Калі наймалі людзей на працу, то абавязкова запрашалі за стол і назіралі за тым, як хто есць. Лічылася, калі чалавек есць хутка, шмат, але акуратна, то ён будзе добрым памочнікам. Назіралі за тым, як ядуць дзеці. Меркавалі, калі дзіця есць хутка, то з яго атрымаецца увішны чалавек, які будзе паспяваць усё выконваць своечасова і якасна.

У той жа час сярод простага люду ніколі не паважалі тых, хто пераядаў, заседжваўся доўга за сталом. У свядомасці славян існавала ўяўленне: калі чалавек есць шмат, быццам за дваіх, то за яго спінай знаходзіцца нячыстая сіла.

**Калі ежу раскладвалі па талерках, то з'ядаць трэба было ўсё, інакш той, хто пакідаў ежу, згубіць сваё здароўе і дабрабыт. Шырока бытавала меркаванне аб тым, што чалавек, які даядае чужы кавалак хлеба, «перахоплівае» чужую сілу і здароўе. Нельга было дазваляць каму-небудзь дапіваць са сваёй конаўкі. Той, хто дапівае, будзе ведаць чужыя задумы.**

**Існавала строгае патрабаванне: есці адзін кавалак хлеба можна было толькі мужу і жонцы. Але пры гэтым лічылі: калі жанчына даядае хлеб пасля мужа, то ён будзе «бегаць» за ёю, і наадварот.**

У час яды забаранялася чытаць, каб не страціць свой розум і памяць.

Прымячалі: калі адзін з удзельнікаў харчавання закашляўся, то гэта значыла, што нехта спяшаецца ў госці; калі чалавек выпусціў з рук ежу, гэта сведчыла аб тым, што яму нехта зайздросціць.

Да завяршэння сямейнай трапезы з-за стала можна было выйсці толькі з дазволу гаспадара. Пасля завяршэння сямейнай трапезы абавязкова неабходна было выказаць падзяку Нябёсам і прыбраць посуд, інакш ноччу ў хаце будзе «піраваць» нячыстая сіла. Нават калі яда была не зусім смачнай, было не прынята гаварыць кепскія словы ў адрас ежы і тых, хто яе прыгатаваў.

Непрыбраным стол пакідалі толькі ў дні ўшанавання памерлых: на Радаўніцу, Масленічныя, Траецкія, Восеньскія Дзяды, а таксама на трэці, дзявяты, саракавы дзень і на ўгодкі пасля смерці чалавека. У асобных мясцінах Гомельшчыны да нашых дзён існуе звычай тры дні не прыбіраць посуд, калі нехта з суродзічаў паехаў у далёкую дарогу.

**Залатое правіла народнай культуры патрабавала: аддаючы з хаты прадукты харчавання, напрыклад, хлеб, малако, муку, памятайце, што нельга аддаваць апошняе, іначай сам застанешся ні з чым.**

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

*(Працяг будзе.)*

# Моладзь Беларусі і Расіі аб'ядноўвае дружба

**Дзясяты раз у верасні пройдзе Міжнародны фестываль «Моладзь Беларусі і Расіі ў XXI стагоддзі разам». Сёлета ўпершыню ў ім у якасці гасцей прыме ўдзел расійская дэлегацыя горада-партнёра Юрга. Усяго мерапрыемства, якое будзе ладзіцца ў Жодзіне, збярэ больш як шэсцьсот юнакоў і дзяўчат дзвюх краін.**

Як адзначаюць арганізатары, сёлетні фэст будзе адрозніваецца ад папярэдніх тым, што адкрые новыя гарызонты для яго ўдзельнікаў. А дакладней, акрамя традыцыйных мерапрыемстваў: навукова-практычнай канферэнцыі, творчых вечароў, КВЗ, спартыўных спаборніцтваў і экскурсій, на гэтым форуме запланавана правядзенне турыстычнай эстафеты, чэмпіянату па камп'ютарных гульнях і конкурсу эстраднай песні. Яшчэ адно навашвядзенне — у Жодзіне падчас правядзення форуму з'явіцца прэс-цэнтр маладых журналістаў.

Каб прыцягнуць на фестываль як мага больш удзельнікаў, сёлета выбрана новае месца яго адкрыцця. На гэты раз яно адбудзецца ў гарадскім парку культуры і адпачынку (нагадаю, раней адкрыццё праходзіла на гарадскім стадыёне, дзе колькасць гледачоў была абмежаваная). Адкрые фестываль шэсце ўсіх удзельнікаў па адной з галоўных вуліц горада — праспекце Міру.

На думку арганізатараў, праграма сёлетняга фэсту дазваляе ў поўнай меры кожнаму ўдзельніку праявіць сваю актыўнасць, прадэманстраваць асабістыя дасягненні, уменні і навыкі, знайсці новых сяброў і, самае галоўнае, добра адпачыць. Яшчэ, без сумнення, такія мерапрыемствы прапагандуюць здаровы лад жыцця, а моладзь дзвюх краін можа абмяняцца сваімі напрацоўкамі па самых разнастайных пытаннях працы і адпачынку. Дадам, сёлета юбілейны Міжнародны фестываль «Моладзь Беларусі і Расіі ў XXI стагоддзі разам» пройдзе ў Жодзіне з 2 па 7 верасня.

**Святлана СУХАРКО.**

## Муз-news

### ЧАТЫРЫ ІПАСТАСІ АЛЯКСАНДРА КУЛІНКОВІЧА

**Рэжысёрская група Анатоля Вечара ў рамках праграмы «ПРАсоўванне+» («ЛАД») зняла гурту «Нейра Дзюбель» новы кліп. Работа гэтая настолькі спадабалася музыкантам, што «дзюбелі» маюць намер яе выкупіць і прадставіць гледачам іншых тэлеканалаў.**



Здымкі на песню «Можна жыць» адбываліся ў былым бамбасховішчы, дзе знаходзіцца рэпетыцыйная база гурта. Лідару «Нейра Дзюбель» Аляксандру Кулінковічу давялося, па задуме рэжысёраў, за тры хвіліны прымераць чатыры зусім розныя вобразы: міліцыянера, прадпрымальніка, музыканта і бамжа. «Ідэя кліпа — паказаць, як па-рознаму можна жыць, — расказвае Аляксандр. — Праўда, у канцы ўсе чамусьці паміраюць. У Толі Вечара ўсе кліпы нейкія «смяротныя».

Насамрэч падчас здымак ніхто не памёр, але некалькі чалавек атрымалі траўмы: бэк-вакаліст пры пераносцы рэквізіту расцягнуў звязкі і некалькі дзён кульгаў, а сам Кулінковіч, увайшоўшы ў ролю бамжа, так актыўна корпаўся ў баку для смецця, што... атрымаў дзве трэшчыны ў рэбрах. Давялося нават класціся ў бальніцу.

Зрэшты, музыканты лічаць, што творчы працэс быў варты такіх пакут — выніковы матэрыял ім надзвычай спадабаўся. Паводле ўмоў праекта «ПРАсоўванне+», зняты для праграмы відэакліп музыканты могуць выкупіць за прымальную суму. Гэта і мае намер зрабіць «Нейра Дзюбель», каб прадставіць кліп і на іншых тэлеканалах. Акрамя таго, у бліжэйшых планах гурта — перавыданне самага вядомага свайго альбома «Паляўнічы і сайгак», запісанага роўна 10 гадоў таму. Менавіта за гэты альбом, нагадаем, калектыў атрымаў цэлыя 4 рок-кароны, уключаючы галоўную.

### ЦАЛКАМ ЛЕГАЛЬНЫ «КАЙФ»

**29 жніўня ў гурта «Лялькі» выходзіць новы альбом з назвай «Кайф», і практычна адразу ж музыканты прэзентуюць пласцінку на канцэрце ў Мінску. Над новым альбомам (у яго ўвайшлі 11 новых кампазіцый) самы папулярны з альтэрнатыўных калектываў Беларусі працаваў два гады.**

«Мы хацелі стварыць новы гук, і ў нас гэта атрымалася! — радуецца лідар гурта «Лялькі» Сяргей Дубовік. — У ходзе запісу, акрамя стандартнага набору жывых інструментаў, мы выкарыстоўвалі розныя перкусійныя інструменты, гукавыя эфекты... І пры ўсім тым гук атрымаўся нашым, пазнавальным: з элементамі рэпу, стрыт-кору і хіп-хопу. Стопрацэнтная альтэрнатыва!». Атрыманае музыкамі задавальненне ад выкананай работы, уласна, і дало назву альбому. А тое, што па-за яго межамі засталося яшчэ многа матэрыялу — гэта нават да лепшага, будзе з чаго рабіць наступную пласцінку.

У падтрымку альбома гурт «Лялькі» выступіць 30 жніўня ў Мінску на фестывалі «Галасы вуліц». У канцэрце, дарэчы, хапае і іншых вядомых сярод альтэрнатыўшчыкаў імёнаў: «Нестандартны варыянт», «Гарадскі сум», «Падвальныя рыфмы», DED і іншыя.

**Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## Рок, «зоркі» і светлая памяць

**Лепшыя рок-выканаўцы Беларусі 19 верасня збяруцца ў Мінску на сумесны канцэрт, прысвечаны памяці музыканта Андрэя Вашкевіча — лідара гурта «Каханне і спорт».**

Андрэю Вашкевічу, якога не стала гэтым летам, было ўсяго 34 гады. Але зрабіць за гэты час ён паспеў вельмі многа. Менавіта «Каханне і спорт» першым з беларускіх гуртоў паспрабавала зрабіць папулярную музыку экспартным прадуктам, цікавым для замежнікаў. І нягледзячы на тое, што ў апошнія гады Андрэй Вашкевіч займаўся аховай аўтарскіх правоў у сферы музыкі, ён усё адно заставаўся музыкам — яркім і таленавітым.

19 верасня ў КЗ «Мінск» свае песні, а таксама песні гурта «Каханне і спорт» выканаюць артысты, неабыякавыя да падзей у беларускай музычнай прасторы — не толькі сябры Андрэя, але і тыя, хто проста хоча праявіць спачуванне і салідарнасць. У спісе выступоўцаў — гурты «Сярэбранае вяселле», «Крама», «Па вачах», «Палац», «Клёндайк», «Драздьі», «Нака», Віталь Артыст, Руся, Атмараві, Дзмітрый Вайцюшкевіч і іншыя. «Блізкія людзі і калегі заўжды хочуць зрабіць нешта, каб памяць аб чалавеку жыла як мага даўжэй, — кажа Арцём Залескі, барабаншчык гурта «Сярэбранае вяселле» і сябар Андрэя. — Мы ўмеем іграць музыку. Таму з гатоўнасцю выступім у канцэрце памяці нашага сябра, каб падтрымаць яго сям'ю не толькі маральна». Канцэрт будзе дабрачынным, усе атрыманыя ад яго сродкі будуць перададзеныя сям'і артыста: бацькам, жонцы, дзецям.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# НЯЎВАЖЛІВАСЦЬ ПЕШАХОДУ НЕ ТАВАРЫШ

## Пад дэвізам «Бяспечную дарогу дзецям» 29 жніўня ў Рэспубліцы Беларусь праводзіцца Дзень бяспекі дарожнага руху

**Лета заканчваецца. Дзеці вяртаюцца з летнікаў, ад бабуль і дзядуляў і пачынаюць рыхтавацца разам з бацькамі да новага навучальнага года. За тры месяцы яны расслабляюцца, забываюцца, што ў горадзе транспарт ходзіць у некалькі разоў інтэнсіўней, чым у вёсцы... Аб гэтым сведчыць невясёлая статыстыка.**

— Толькі за апошні летні месяц на тэрыторыі нашай краіны загінулі 9 дзяцей, 57 з траўмамі дастаўлены ў бальніцы, — адзначыў <u>**начальнік ДАІ МУС Беларусі Аляксандр МЕНДЗЕЛЕЎ**</u>. — За няпоўныя сем месяцаў гэтага года мы згубілі ажно 35 няпоўнагадовых хлопчыкаў і дзяўчынак. Больш за ўсё ДТЗ з лятальным зыходам зафіксавана ў Мінскай (8 загінулых), Гомельскай (7 загінулых) і Гродзенскай (5 загінулых) абласцях. Таму ў апошні тыдзень жніўня і першы тыдзень верасня ДАІ краіны актывізуюць прафілактычную работу па папярэджанні дзіцячага транспартнага траўматызму і прыцягненні ўвагі да праблемаў бяспекі дарожнага руху.

Прынамсі, у гэты час па ўсёй Беларусі праводзяцца спецыяльныя комплексныя мерапрыемствы «Увага — дзеці!». Акрамя таго, да 31 жніўня ўключна ў сталічным выставачным цэнтры «БелЭКСПА» праходзіць выстава «Нашым дзецям — 2008», арганізаваная ДАІ МУС.

— Дзяржаўтаінспекцыя пастаянна бярэ ўдзел ва ўсіх дзіцячых выставах, — паведамілі мне ў прэс-цэнтры ДАІ МУС. — Зараз у выставачным цэнтры праходзіць школьны кірмаш, які дапамагае супрацоўнікам міліцыі праводзіць прафілактычную работу не толькі з дзецьмі, але і, што не менш важна, з іх бацькамі.



*Вольга СУВОРАВА падчас рэйду прымеркаванага да Дня бяспекі дарожнага руху, тлумачыць выхаванцам сацыяльна-педагагічнага цэнтра Савецкага раёна горада Мінска, як трэба паводзіць сябе на дарозе.*

***Памятайце, што вучыць азбуку дарог неабходна кожны дзень, у першую чаргу, на асабістым прыкладзе.***

***Вялікі башлык, плэер, размовы па мабільным тэлефоне ў час перасячэння праезнай часткі могуць абмежаваць агляд, рассеяць увагу.***

***Вучыце дзяцей назіраць: у час прагулкі звяртайце іх увагу на работу святлафораў, тлумачце значэнне дарожных знакаў, разметкі, вучыце іх уважліва глядзець на дарогу, прадбачыць небяспеку.***

Сёлета быў выбраны не зусім традыцыйны падыход: вырашылі задзейнічаць у выставе ДАІ ўсіх абласцей і горада Мінска. Кожная дэлегацыя на працягу аднаго дня знаёміць наведвальнікаў са сваімі метадамі работы, літаратурай. Акрамя таго, кожны ахвотны можа праявіць эрудыцыю і выйграць флікер. Для гэтага патрэбна разгадаць крыжаванку ці адказаць на пытанне, звязанае з дарожнай тэматыкай. Адным словам, інспектары аддалі перавагу не сумным лекцыям, а павучальным гульням.

— У час канікулаў, як правіла, павялічваецца колькасць ДТЗ з удзелам дзяцей школьнага ўзросту. Толькі на тэрыторыі Брэсцкай вобласці з пачатку года зафіксавана 53 ДТЗ з удзелам дзяцей, 3 чалавекі загінула, 57 атрымалі раненні, — адзначыў <u>**начальнік ДАІ УУС Брэсцкага аблвыканкама Сяргей ТАЛАТАЙ.**</u> — Напрыклад, на днях хлопчыка, які перабягаў у неўсталяваным месцы дарогу, збіў аўтамабіль. Зараз ён знаходзіцца з цяжкімі траўмамі ў бальніцы. Для гэтага школьніка, на жаль, навучальны год пачнецца пазней, чым для астатніх. Каб папярэдзіць такія няшчасці, кожны інспектар замацаваны за навучальнай установай, дзе ў Дзень ведаў будзе праводзіць гутарку з дзецьмі, тым, каму неабходна раздаваць флікеры. Задача супрацоўнікаў міліцыі зрабіць усё магчымае, каб на месца няўважлівасці школьнікаў як мага хутчэй прыйшла ўвага, без якой нельга адпраўляцца ў дарогу.

— Вядома, што «дзяцей вучаць у школе». Нават песня ёсць такая, — гаворыць старшы <u>**інспектар агітацыі і прапаганды ДАІ Савецкага РУУС горада Мінска Вольга СУВОРАВА.**</u> — Аднак дзіця, прыйшоўшы ў школу, ужо мае, як правіла, багаты вопыт падарожжаў па вуліцах і дарогах, у тым ліку і сотні пераходаў цераз дарогу. За гэты час у яго сфарміраваліся вызначаныя навыкі «транспартных» паводзінаў — і правільныя, і не зусім правільныя. Апошніх, на жаль, як паказвае практыка, нямала. Гэта і перабяганне цераз дарогу замест таго, каб пераходзіць мерным крокам, назіраючы пры гэтым за рухам справа і злева. Гэта і пераход вуліцы па кароткім шляху — накрыж. Але самае страшнае — маса навыкаў выбягання з-за стаячых машын і іншых перашкод агляду: кустоў, парканаў, дрэў, з-за вуглоў дамоў, арак. Вучыць дзіця паводзінам трэба, як толькі яно пачало хадзіць. І важную ролю тут адыгрывае сям'я. Мадэль правільных паводзінаў на вуліцы і дарозе дзіця асвойвае ў дашкольным узросце, калі побач з ім самыя блізкія людзі, у першую чаргу — маці.

**Надзея ДРЫЛА.**

# ПАМІЖ ЧОРНЫМ І РУЖОВЫМ



**Гэту дзяўчынку лічаць у класе адной з лепшых вучаніц, яна ходзіць у нядзельную царкву, у вольны час любіць маляваць. Глядзець бы бацькам і радавацца на такую дачку. А яны...**

**Мама ў трансе: Людка пасябравала з адной аднакласніцай, якая ўвесь час ходзіць у чорным. Нібыта падмянілі дачку. Ну, мяркуйце, замест таго, каб паслухмяна нешта зрабіць, яна пачынае задаваць пытанні — і гэта ёй толькі трынаццаць! Не апрануць яе нармальна і прыгожа — усё выбірае нейкае аднастайнае адзенне. І не, каб нармальную музыку паслухаць, якая пасуе дзяўчынкам у яе ўзросце, а ўсё нешта сумнае ёй падабаецца... «Няўжо ў вашай сям'і з'явілася дзяўчынка-эма?» — здагадваюся я. І прыгадваю, як прыкладна ў такім жа ўзросце сама фанацела ад цяжкага року, у прынцыпе, таксама любіла апранацца ў чорнае, і нельга сказаць, каб зусім адмовілася ад гэтых сваіх прыхільнасцяў цяпер. Таму вузкія джынсы з кедамі на маёй хрэсніцы і значкі, шэрагамі прымацаваныя да яе сумкі, мяне ніколькі не бянтэжаць, а нават выклікаюць настальгічную ўсмешку: дзе ж мае 13 гадоў?! Так прыкольна...**

**Яе тата, прыстойны і вельмі сур'ёзны чалавек, які мае навуковую ступень, аднак некалі таксама любіў слухаць рок і цяпер, у свае 40 гадоў яшчэ здольны здзіўляць цётачак у тралейбусе сваімі доўгімі валасамі, катэгарычна не прымае розных там «эма-фішак»: «У наш час гэта быў пратэст супраць таго, што савецкая школа ўсіх імкнулася зрабіць аднолькавымі, а мы хацелі быць непадобнымі хоць чымсьці. Мы хацелі не проста слухаць музыку, а імкнуліся думаць пад яе. А ім музыка патрэбная, каб плакаць. Адчуйце розніцу».**

Прызнацца, не адчуваю ніякай розніцы, калі бачу катэгарычна адмоўную рэакцыю дарослых на спробы пошуку ўласнага «я» дзецьмі. Ва ўсе часы былі маладыя хлопцы і дзяўчаты, якія імкнуліся вылучыцца з натоўпу, стаць не такімі, як усе, супрацьпаставіць сябе кансерватыўнаму свету. Так нараджаліся новыя субкультуры: панкі 60-х, рокеры 70-х. Так нараджаюцца сучасныя маладзёжныя плыні. Цяпер распаўсюджваецца рух готаў і эма. Але што тады, што цяпер — кожнае пакаленне, якім бы прасунутым яно ні здавалася б самому сабе, здзіўляецца з нагоды нейкіх дзіўных захапленняў сваіх дзяцей. І добра, калі імкнецца зразумець сутнасць гэтых захапленняў. Бацькам Люды ўсё пра модныя субкультуры эма і готаў расказалі на адным з бацькоўскіх сходаў у школе, пад лозунгам: «Будзьце пільнымі».

Мая пляменніца сама расказала тату з мамай пра аднакласніц, якія сталі хадзіць на эма-тусоўкі. Тата, былы вайсковец, паказаў кулак: «Толькі паспрабуй мне...» У Лізаветы хутка знайшоўся пераканаўчы для бацькоў аргумент: «Вы ж ведаеце, я ж не люблю ружовы колер». А літаральна праз пару месяцаў я назірала, як тата з мамай яшчэ дзвюх юных паненак даволі спакойна пазіраюць на ўвітыя рознымі бранзалетамі рукі дачок — ну, няхай пазабаўляюцца. І тое праўда: спакойныя, сціплыя, разумныя дзяўчынкі. Што іх прыцягнула ў эма-культуры, я, напрыклад, нават не дзіўлюся. У суцэльным панаванні і навязлівасці гламуру яны імкнуцца быць непадобнымі на экранных ды часопісных прыгажунь у каруначках ды стразіках. Напэўна, эма і готаў сёння можна лічыць своеасаблівым «антыгламурам», сутнасць якога якраз у тым, каб клапаціцца не пра прыгажосць розуму, а пра прыгажосць знешнюю з усімі яе «правільнымі» параметрамі. А сярод гэтага бліскучага натоўпу вылучыцца не так проста, як нават было раней.

**УНІФОРМА**

Чорнае грубае адзенне, доўгія спадніцы, высокія боты на шнуроўцы — па гэтых прыкметах можна пазнаць гота. «Баявая расфарбоўка» гота таксама кідаецца ў вочы: доўгія валасы, якія звычайна пафарбаваныя ў чорны колер, вочы моцна падведзеныя чорным алоўкам, а сам твар вельмі бледны. Нешта ўсё гэта вельмі падобнае на тое, што мы вывучалі ва ўніверсітэце пра дэкаданс: суцэльны ўпадак, знешняя форма якога — усяго толькі выражэнне змрочных думак пра сутнасць жыцця.

Але эма ў гэтым сэнсе пайшлі далей, яны не хаваюць сваіх эмоцый, а наадварот паказваюць іх. Ды і слова само пайшло ад англійскага «эмоўшын». Чатырнаццацігадовая Яна тлумачыць, што ў грамадстве ўсе імкнуцца заўсёды паказаць, як ім добра і хораша жывецца, дэманструюць усмешку нават тады, калі людзям, магчыма, усміхацца зусім не хочацца. Ці ж гэта не падман іншых ды і саміх сябе? Ненатуральнасць. Фальш. Прыхільнікі эма ўпэўненыя: любыя чалавечыя эмоцыі вартыя таго, каб выходзіць знутры, і калі хочацца плакаць, ну, напрыклад, з-за няшчаснага кахання, то навошта стрымліваць слёзы?

Але эмоцыі ў навакольных здольны выклікаць нават іх знешні выгляд. Эма любяць розныя аксесуары: павязкі на руках, бранзалеты з чарапамі і жалязякамі, рамяні з шыпамі, пальчаткі без пальцаў, значкі на рукзаках і сумках. Звычайна адзенне эма складаецца з дзвюх кантрасных колераў, у асноўным чорнага і ружовага. Але асноўным тонам можа быць і шэры, а з ім змешваюць ружовы, аранжавы, ці іншы яркі колер. Яны носяць вузкія джынсы ці нагавіцы з жалезнымі клёпкамі і футболкі ў абліпку. На нагах — боты ці кеды. Але вянчае вобраз асіметрычная стрыжка з доўгай чолкай, з-пад якой выглядваюць выразныя вочкі, нафарбаваныя чорнай падводкай. Але ўсё гэта прыдумана дзеля таго, каб прыцягнуць увагу да сваёй ідэалогіі: не сорамна паказваць свае эмоцыі, плакаць, распавядаць пра свае праблемы і перажыванні, нават хлопчыкам.

**МУЗЫ І Kº**

У мяне імідж прасунутай цётачкі. Канешне, я проста прыходжу ў госці, і мне не трэба думаць штодня, як зарабіць для іх грошы і чым накарміць. Я заходжу да іх у пакой і магу разняволена пацікавіцца, што яны слухаюць. Нават казыраю вядомымі для іх назвамі. Дастаткова назваць гурт «Tokio Hotel».

Дзяўчынка Яна ацаніла мае веды. І тут жа паспрабавала зрабіць рэверанс: «Мы ведаем гурт «KiSS». У іх была такая арыгінальная расфарбоўка. Прыкольна...»

Практычна ўсе субкультуры нараджаліся вакол пэўнага стылю музыкі. Готы і эма ў гэтым сэнсе не выключэнне. Готы любяць Theatre of tragedy, Lacrimosa, Samsas Traum, Chris Pohl і нават Marilyn Manson, хоць апошні да стылю «готыкі» прамога дачынення не мае.

Музыка эма з'явілася ў 80-я гады мінулага стагоддзя ў Амерыцы і з'яўлялася эмацыянальным напрамкам панк-року. Удзельнікі амерыканскага гурта Rites of Spring заявілі ў 1985 годзе, што фанаты назвалі іх творчасць загадкавым словам «эма». А ўсё з-за таго, што саліст час ад часу дадаваў у песні асабістую лірыку і ўласныя эмоцыі, а ў некаторыя моманты яго голас станавіўся падобны на дзявочы стогн. Самі музыканты гурта «эма» як жанр ніколі не прызнавалі. Але тэрмін замацаваўся.

Напрыканцы мінулага стагоддзя гэты жанр аднавіўся, пераняўшы нейкія элементы «глэма» і гатычнай культуры, а таксама адчуў уплыў поп-музыкі. Квартэт з Германіі «Tokio Hotel» — адзін з найбольш папулярных эма-гуртоў, таксама як і спявачка Avril Lavigne. І калі хто хоча размаўляць на адной мове з эма-дзецьмі, то варта запомніць хоць бы назву першага гурта — павага да такіх дарослых дакладна забяспечана. Эма — па сутнасці такі напрамак у музыцы, дзе выконваюцца песні пра каханне і іншыя вельмі глыбокія пачуцці на фоне цяжкага гітарнага суправаджэння, а меланхалічны вакал месцамі пераходзіць у крык. Але ў апошні час, калі разглядаюць той ці іншы музычны праект з пункту гледжання эма, то больш звяртаюць увагу на яго знешні выгляд. Ды і сама музыка эма становіцца ўсё больш разнастайнай, у апошнія гады з'явіліся такія варыянты, як хардкор-эма ці нават эма-рэп!

**ТЭРЫТОРЫЯ**

Яны ходзяць у школу ці інстытуты. Бачаць і вылічваюць адзін аднаго беспамылкова, збіваючыся ў групоўкі. Звычайна і тусуюцца па месцы вучобы, так прасцей. І знаходзяць аднадумцаў на інтэрнэт-форумах. Зразумела, што распаўсюджанасць гэтых плыняў залежыць ад памеру горада, дзе з'явіліся готы ці эма. І калі іх яшчэ не так многа ў Мінску, то не выключана, што для правінцыі з'яўленне такіх падлеткаў на вуліцы можа стаць ледзь не экзотыкай.

Эма і готы паважаюць права іншых на самавыяўленне. І абсалютна не выключана, што эма-дзяўчынка можа пасябраваць з хлопцам-готам.

Aleks Grig, так сябе называе студэнт БДУ, а калі зусім проста, то Алесь. Ён пасябраваў са сваёй неардынарнай аднакурсніцай, якая аказалася готкай. Простага хлопца з правінцыі яна пакарыла не толькі знешнім выглядам і заўсёды сур'ёзным тварам. І ў выніку ён сам пранікся сімпатыяй да яе сістэмы каардынат. Мама не супраць: гэта нават эканамічна выгадна, калі сын схільны да мінімалізму і носіць чорнае «не маркае» адзенне. Абы на вучобу гэта не ўплывала. Імкнуся высветліць, якая насамрэч розніца паміж эма і готамі.

— Ну, скажаце... — чую ў адказ здзіўленне на мяжы абурэння. — Эма — гэта па сутнасці дзеці, надта эмацыянальныя падлеткі, якія супрацьпастаўляюць сябе даросламу свету з яго стэрэатыпамі. Дзеці, якім не хапае нейкай насычанасці ў жыцці, бракуе ўвагі, любові, нейкага разумення, вось яны і прыцягваюць да сябе ўвагу такімі гульнямі. Ды і ўсе гэтыя «фішкі» знешнія — дзяцінства. Стракатае і рознакаляровае, якое ў іх жыве. Яны ўсе добрыя, мірныя, ненавідзяць зло, якога шмат у свеце. Эма пяшчотныя, нібыта мяккія цацкі, хоць самі па сабе вельмі ранімыя. Увесь час пакутуюць ад непадзеленага кахання і самі падтрымліваюць свой боль, але ўмеюць шчыра, па-дзіцячы, радавацца. Эма жывуць простымі эмоцыямі і не імкнуцца іх кантраляваць. А чорны колер яны абралі дзеля нейкага сімвалізму. У іх няма нічога агульнага з готамі, якія старэйшыя за іх і чорны выбіраюць свядома. Чорны колер — гэта колер схаванасці. Нейкай містыкі. Готы стрыманыя, ніколі не скардзяцца, таму што моцныя. Калі чалавек перажыў нейкую чорную паласу ў жыцці, то гэта яго загартавала. У готыку трапляюць тыя, хто атрымаў нейкі падобны вопыт. Эма павярхоўныя і наіўныя дзеці ў параўнанні з готамі. Готыка — асэнсаваны і праўдзівы стыль, які дазваляе абараняць свой пункт гледжання і патрабуе ад чалавека кантролю над сваімі эмоцыямі. Чалавек павінен быць моцным, нават перад тварам смерці. Вось гэта крута!..

**ТАКАЯ МІСТЫКА**

Слухаю і разумею, што, па сутнасці, гісторыя чалавецтва — гэта супрацьстаянне эма з готамі. Калі другія імкнуцца падпарадкаваць сабе першых. Толькі ў гэтых сучасных гульнях паміж прадстаўнікамі гэтых субкультур няма варожасці. Яны суіснуюць мірна. Напэўна таму, што готы ўпэўнены: эма, калі вырастуць, абавязкова навучацца валодаць сваімі эмоцыямі і тады... стануць па сутнасці готамі.

І ўсё б нічога: падкая моладзь на розныя «фішкі» — і няхай сабе. Каб не даволі радыкальныя лозунгі чорна-ружовых. Яны замацаваныя ў «43 правілах эма». Сярод іх ёсць, напрыклад, такое: «Выраз «Я ненавіджу сябе, я хачу памерці» павінен стаць тваім дэвізам». Ці такое: «Плач заўсёды і паўсюдна, дзе ёсць людзі. Калі будзеш плакаць у адзіноце, хто будзе цябе шкадаваць?» У любога адэкватнага падлетка ўсе гэтыя фразы выклічуць смех. Але ж ёсць і такія, якія хапаюць усё на ляту і захапляюцца сур'ёзна і надоўга. Вось за такіх, безумоўна, варта хвалявацца.

А калі дзіця разважанні пра свае пакуты і няшчасці ператворыць у стан душы і светапогляд? Вось у готаў жа разважанні пра смерць — у парадку рэчаў. Магчыма, таму псіхолагі і спецыялісты па пытаннях моладзі прыглядаюцца да гэтых модных цяпер плыняў, якія ў Расіі ўжо сталі даволі распаўсюджанымі, а ў нас толькі набіраюць моц. І ў Расіі, напрыклад, пытанні наконт гэтых субкультур узнімаліся ў Дзяржаўнай думе, а самі плыні называліся «небяспечнымі плынямі сярод падлеткаў», якія распаўсюджваюць развіццё дэпрэсій і самазабойстваў, адасобленасць ад грамадства. Гэта калі капаць вельмі глыбока...

Калі разабрацца, то ўсё гэта ўжо было ў сусветнай культуры і літаратуры. Але нам ніхто не забараняў чытаць змрочныя апавяданні Эдгара По з яго захапленнем смерцю, ніхто не выключыў з праграмы вывучэння літаратуры дэкаданс. І тым больш, ніхто не можа пасягнуць на творы Дастаеўскага, які самым найлепшым чынам увасобіў на старонках сваіх кніг чыстыя і непрыхаваныя чалавечыя эмоцыі задоўга да таго, як эма аформілася ў асобную плынь.

Так, я разумею бацькоў, якія непакояцца — і правільна робяць. І разумею тых, хто імкнецца перш за ўсё даведацца ў дзяцей, адкуль у іх такая цяга да чорнага? Магчыма, прычына якраз-такі ў саміх дарослых, якія сваімі паводзінамі паказваюць дзецям прыклад аднаго ці другога падыходу да жыцця, чаго ж тады потым палохацца, калі ў дзецях гэта ўсё праяўляецца з узмоцненай сілай... Зрэшты, асабіста мяне значна больш палохаюць падлеткі, якія разгульваюць па вуліцы з бутэлькамі піва і брудна лаюцца, чым абсалютна мірныя дзеці ў чорным і ружовым, якія самавыяўляюцца.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# ДВА Ў АДНЫМ: ЗАРАБЛЯЦЬ І ВУЧЫЦЦА

**У Магілёўскай вобласці стала папулярным завочнае прафтэхнавучанне. Маладыя людзі хочуць адначасова вучыцца і працаваць.**

26-гадовая жыхарка Магілёва Надзея — прадавец у харчовай краме. Больш за дзесятак гадоў таму яна закончыла прафесійна-тэхнічнае вучылішча, а цяпер паступіла ў каледж імя Арлоўскага на завочнае аддзяленне.

— Так, я сумяшчаю працу і вучобу, — кажа маладая жанчына. — Я лічу, што гэта вельмі добры, эканамічны варыянт. Я замужам, дачка — малодшая школьніца. Сям'я патрабуе сродкаў і ўвагі. Чым кінуць працу і штодня хадзіць на заняткі, я лепш буду зарабляць і ні ў чым не адмаўляць сабе і дачцэ. Але ў мяне ёсць і стымул вучыцца: верагодна, што з новым дыпломам атрымаю іншую пасаду і большы аклад, калі стану таваразнаўцам.

Магілёўскі дзяржаўны агралесатэхнічны каледж імя Арлоўскага — адзін з «першапраходцаў» у завочным навучанні. Гэта ўстанова атрымала ліцэнзію яшчэ летась, таму што цяпер, па словах намесніка дырэктара каледжа па вучэбнай працы Алены Лунгіс, адчуваецца ўсплеск цікавасці да атрымання адукацыі, як трапна казалі за савецкім часам, без адрыву ад вытворчасці. Сёлета ў каледжы будзе вучыцца больш за сотню завочнікаў.

— Напрыклад, у нас можна вучыцца камерцыйнай дзейнасці з атрыманнем спецыяльнасці таваразнаўцы, як гэта робіць Надзея, — расказвае Алена Анатольеўна. — Правільна, летась на гэта аддзяленне масава паступалі прадаўцы і загадчыцы сельскіх крамаў, якія мелі вялікі стаж, але якім не хапала адукацыі. А сёлета спецыяльнасць таваразнаўцы спатрэбілася маладым дзяўчатам, якія толькі што атрымалі дыплом прадаўца і ўладкаваліся на працу. Прэстыж адукацыі быў і застанецца ва ўсе часы, таму яны працягваюць вучобу. Толькі робяць гэта завочна, каб атрымліваць сродкі на існаванне.

Каледж імя Арлоўскага вучыць на завочным аддзяленні і работнікаў лясной гаспадаркі. Гэта галіна развіваецца імкліва, але больш за тысячу яе работнікаў не маюць спецыяльнай адукацыі. Яны — добрыя практыкі, якім патрабуюцца тэарэтычныя веды і пацверджаная дыпломам спецыяльнасць тэхніка лясной гаспадаркі. Магілёўскае вытворчае лесагаспадарчае аб'яднанне, паведамілі ў каледжы, дае заяўкі на паступовую падрыхтоўку соцень кадраў. Маладыя людзі, якія маюць рабочыя прафесіі, ідуць завочна павышаць кваліфікацыю.

— Рынак працы вельмі мабільны, і ў адпаведнасці з патрэбамі і прафтэхнавучанню даводзіцца мяняць напрамкі, — каментуе намеснік начальніка ўпраўлення адукацыі Магілёўскага аблвыканкама Віктар Бурака. — Напрыклад, сёння вялікая ўвага надаецца будаўнічым прафесіям. Сёлета мы павялічылі на іх набор — на 400 чалавек. А заўтра, не выключана, спатрэбяцца швачкі. Адно з прадпрыемстваў па пашыве бялізны мае планы адкрыць вытворчасць у Магілёве, і мы будзем рыхтаваць для іх работніц лёгкай прамысловасці. Прафтэхнавучанне сёння арыентуецца на патрэбы людзей.

— Маладыя людзі ідуць на свой хлеб — і гэта самая галоўная прычына запатрабаванасці завочнага прафтэхнавучання, — лічыць Алена Лунгіс. — Да нас у каледж прыходзяць дзеці з сем'яў сярэдняга дастатку альбо ніжэй за сярэдні. Ім трэба як мага хутчэй завяршыць вучобу і зарабляць грошы сабе на жыццё. Тым больш што да гэтага моманту многія з іх жэняцца альбо выходзяць замуж, з'яўляюцца дзеці. Аднак каб зарабляць больш грошай, трэба павышаць адукацыю. І найбольш зручна гэта зрабіць завочна.

Завочнае навучанне — гэта сесіі два разы на год. Паводле заканадаўства, на 3 тыдні ўзімку і ўлетку арганізацыя адпускае свайго работніка вучыцца, і нярэдка аплачвае гэты водпуск.

Галоўная задача выкладчыкаў — падмацаваць практыку тэорыяй. Прычым пагардлівае стаўленне да завочнай формы навучання ўжо не актуальнае: праграмы і вучэбныя планы аднолькавыя з «вочнікамі», дыпломы абсалютна аднолькавага ўзору.

Яшчэ не так даўно, некалькі гадоў таму, завочныя аддзяленні працавалі толькі ў Мсціслаўскім будаўнічым і Крычаўскім каледжах. Аднак ва ўпраўленне адукацыі сталі звяртацца маладыя людзі з пытаннямі: дзе можна завочна атрымаць спецыяльнасць?

Сёння 6 каледжаў у Магілёўскай вобласці, а гэта палова ад агульнай колькасці, прадастаўляюць такія паслугі. На ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі можна стаць электрыкам, будаўніком, тэхналогам, механікам.

Навучанне можа быць бясплатнае, калі чалавек працуе па прафесіі, і платнае, калі ён хоча атрымаць яшчэ адну, новую спецыяльнасць. Плата ў апошнім выпадку залежыць ад працягласці навучання: яно можа быць ад 10 месяцаў да 1,5 года і каштаваць прыблізна ад 300 да 500 тысяч рублёў.

Ёсць і такія жыццёвыя сітуацыі, калі выпускнікі школ адразу ідуць працаваць рабочымі альбо вучнямі майстра. Але і пра кваліфікацыю забывацца не выпадае: у вытворчых ліцэях за 10 месяцаў у Магілёве можна асвоіць прафесію прадаўца і кухара, у Бабруйску — сацыяльнага работніка. Бабруйскі электратэхнічны каледж прапануе і вячэрнюю форму навучання па спецыяльнасці «Аператар ЭВМ», а ў Магілёве прафесійны ліцэй на вячэрнім аддзяленні навучае цырульнікаў.

— Ведаеце, такія павевы часу, — лічыць галоўны спецыяліст аддзела прафесійна-тэхнічнай адукацыі абласнога ўпраўлення адукацыі Ала Царкоўная. — Мы тут назіраем такую дынаміку: за апошнія два гады ў навучальныя ўстановы, прычым гэта датычыцца і вышэйшай адукацыі, конкурс на завочныя аддзяленні часта большы, чым на дзённыя.

— Я працую зваршчыкам і зарабляю 900 тысяч рублёў штомесяц, — растлумачыў сваю пазіцыю малады чалавек. — Магу сабе набыць дарагі мабільнік, камп'ютар і нават крэдыт на аўтамабіль узяць. Заробак высокі, але і павысіць кваліфікацыю хачу. Таму працягваю вучыцца завочна на машынабудаванні.

Да слова, у Бабруйскім машынабудаўнічым прафесійна-тэхнічным каледжы адкрыта дзве групы завочнага навучання па спецыяльнасці «Тэхналогія зварачнай вытворчасці», дзе могуць вучыцца 50 чалавек. І конкурс вялікі: напрыклад, на працягу двух тыдняў было пададзена адразу 65 заяў. Так што пакуль далёка не кожны, хто хоча, можа адразу трапіць на вучобу.

Да 2010 года, паводле планаў, у кожным каледжы павінны быць адкрыты групы завочнага навучання. Навучальныя ўстановы самі зацікаўленыя ў гэтым, бо гэта і прэстыж, і даходы.

— Цалкам зразумелае жаданне людзей забяспечыць сям'ю сродкамі для існавання, і адначасова атрымаць прафесію ды павысіць кваліфікацыю, — падводзіць вынік Віктар Бурака. — Працаваць і вучыцца — гэта сёння актуальна і перспектыўна. Мы разумеем гэта як сацыяльны заказ. І зробім усё, каб нашы навучальныя ўстановы яго выканалі.

**Ілона ІВАНОВА.**

# ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «ПАДПІШЫСЯ НА «ЗВЯЗДУ»

**I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

1. Рэкламная гульня пад назвай «Падпішыся на «Звязду» (надалей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у тэрмін з 2 верасня па 18 кастрычніка 2008 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» ў адпаведнасці з дадзенымі Правіламі.

2. Арганізатар Гульні — Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» « (надалей — Арганізатар), зарэгістраваная рашэннем Мінскага гарвыканкама ад 02.08.2001 № 1010 у Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў за № 100155376, УНП 100155376, месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

**II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ**

3. Прызавы фонд Гульні фарміруецца за кошт чыстага прыбытку Арганізатара Гульні і складаецца з наступных рэчаў:

| № п/п | Назва | Колькасць | Цана за адзінку (руб.) | Кошт (руб.) | Стаўка ПДВ (%) | Сума ПДВ (руб.) | Усяго з ПДВ (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Майкі чырвоныя з вышыўкай лого | 7 шт. | 14819 | 103733 | 18 | 18672 | 122405 |
| 2. | Бейсболкі сувенірныя з вышыўкай лого | 7 шт. | 9890 | 69230 | 18 | 12461 | 81691 |
| 3. | Гадзіннікі настольныя 47017 ЧНС-020390011 (1)ЗВ2 | 7 шт. | 21920 | 153440 | 18 | 27619 | 181059 |
| 4. | Тэлевізар "Віцязь" 14ctv750-3, г. Віцебск | 7 шт. | 240000 | 1680000 | | | 1680000 |
| 5. | Халадзільнік МХМ-268-00 РБ, ЗАТ "АТЛАНТ" | 1 шт. | 603678 | 603678 | 18 | 108662 | 712340 |

**УСЯГО прызавы фонд** рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» складае 2 777 495 (Два мільёны семсот семдзесят сем тысяч чатырыста дзевяноста пяць) беларускіх рублёў.

**III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ. ПАРАДАК АДБОРУ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ**

4. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на другое паўгоддзе або чацвёрты квартал 2008 года.

5. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Рэдакцыі ў перыяд падпісной кампаніі на чацвёрты квартал 2008 года выразаная з газеты запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая друкуецца да двух разоў у тыдзень у перыяд з 2 верасня па 3 кастрычніка 2008 года ўключна ў газеце «Звязда».

6. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

7. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або паступіўшыя ў рэдакцыю пасля 4 кастрычніка 2008 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

**IV. КАМІСІЯ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ**

8. Для правядзення Гульні Арганізатар стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» (надалей — Камісія) з тэрмінам паўнамоцтваў з 2 верасня па 18 кастрычніка 2008 года ў складзе пяці чалавек.

9. На пасяджэнне Камісіі ў якасці наглядальнікаў без права галасавання могуць запрашацца падпісчыкі газеты або прадстаўнікі незалежных арганізацый.

10. Пасяджэнні Камісіі з'яўляюцца правамоцнымі пры наяўнасці большасці з яе зарэгістраванага складу.

11. Усе рашэнні Камісіяй прымаюцца шляхам адкрытага галасавання простай большасцю галасоў старшыні і членаў Камісіі, якія прысутнічалі на пасяджэнні. У выпадку роўнасці галасоў «за» і «супраць» голас старшыні Камісіі з'яўляецца рашаючым.

12. Рашэнні Камісіі афармляюцца пратаколам, які падпісваецца ўсімі прысутнымі на пасяджэнні членамі Камісіі.

**V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ**

13. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 7 кастрычніка 2008 года ў 12 гадзін у памяшканні Арганізатара Гульні па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

14. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і гораду Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

15. Спачатку разыгрываюцца асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска па адной майцы, адной бейсболцы, аднаму настольнаму гадзінніку і па аднаму тэлевізару «Віцязь».

16. Выйграўшым прыз лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча ўказана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышу кожнага асобнага прыза выцягне наўздагад са скрыні хто-небудзь з падпісчыкаў або прадстаўнікоў незалежных арганізацый. На кожнай такой картцы ўдзельніка ўказваецца выйграны прыз і распісваюцца члены камісіі.

17. Для розыгрышу халадзільніка ўсе астатнія карткі ўдзельнікаў, па якіх не былі выйграны прызы, змяшчаюцца ў адну скрыню і старанна перамешваюцца.

Вызначэнне выйграўшых удзельнікаў адбываецца ў парадку, які ўстаноўлены пунктам 16 гэтых Правілаў.

18. Удзельнікам, якія выйгралі прыз, Арганізатар да 18 кастрычніка 2008 года дасылае паведамленне аб гэтым заказным пісьмом з указаннем тэрміну атрымання прыза.

**VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ**

19. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца прад'яўленне ўдзельнікам, які выйграў прыз, пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другое паўгоддзе або чацвёрты квартал 2008 года.

Пры звяртанні за атрыманнем прыза прадстаўніка ўдзельніка Гульні ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другое паўгоддзе або чацвёрты квартал 2008 года.

20. Выдача прызоў (акрамя тэлевізараў і халадзільніка) ажыццяўляецца ў тэрмін да 20 снежня 2008 года ў памяшканні Арганізатара Гульні па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, за выключэннем выхадных і святочных дзён.

21. Дастаўка і ўручэнне тэлевізараў і халадзільніка ажыццяўляецца Арганізатарам Гульні ў тэрмін да 20 снежня 2008 года ўключна з паведамленнем аб канкрэтнай даце дастаўкі праз публікацыі ў сродках масавай інфармацыі.

Іншыя прызы могуць быць дастаўлены грамадзянам, якія іх выйгралі, па ўзгадненні з Арганізатарам і пры ўмове іх пражывання ў мясцовасці, блізка размешчанай ад мясцовасці пражывання грамадзян, якія выйгралі тэлевізар або халадзільнік.

22. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

23. Пасля 20 снежня 2008 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

**VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

24. Удзельнік Гульні, які выйграў прыз, нясе адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

25. Удзельнікі Гульні, якія выйгралі прызы, і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, фатаграфіі, пісьмы і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Арганізатарам Гульні ў любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Арганізатару Гульні.

26. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду», склад камісіі па яе правядзенні, памер і склад прызавога фонду да пачатку рэкламнай гульні падлягаюць апублікаванню сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў сродках масавай інфармацыі.

27. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 18 кастрычніка 2008 года ўключна ў газеце «Звязда».

28. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне (017) 287 19 68.

*Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі Правілаў правядзення рэкламнай гульні № 1150 ад 27.08.2008 г. выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.*

**СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «ПАДПІШЫСЯ НА «ЗВЯЗДУ»**

1. ЗДАНОВІЧ Уладзімір Аляксандравіч, намеснік галоўнага рэдактара газеты «Звязда»
2. ДОЎНАР Валянціна Аркадзьеўна, загадчык аддзела пісьмаў газеты «Звязда»
3. ЛЯЎКОВІЧ Таццяна Уладзіміраўна, вядучы рэдактар тэхнічны газеты «Звязда»
4. ДАБРАВОЛЬСКІ Анатоль Васільевіч, вядучы рэдактар тэхнічны газеты «Звязда»
5. ДЗЕВОЙНА Алена Уладзіміраўна, рэдактар юрыдычнага аддзела газеты «Звязда»

*Тэрмін паўнамоцтваў Камісіі з 2 верасня па 18 кастрычніка 2008 года.*

**Увага! Карткі ўдзельніка гульні рэдакцыя пачне размяшчаць з аўторка 2 верасня 2008 года.**

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ** на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2008 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ПВ | месца | літар

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА** на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Кошт: падпіскі ________ руб.; пераадрасоўкі ________ руб.

Колькасць камплектаў

на 2008 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

## РАСХОДЫ НА МЕДЫЦЫНУ ЎЗРАСЛІ БОЛЬШ ЧЫМ УДВАЯ

За апошнія пяць гадоў расходы на ахову здароўя ў Мінскай вобласці ўзраслі ў 2,1 раза, а нарматыў бюджэтнай забяспечанасці ў разліку на аднаго жыхара — у 2,5. Вялікая ўвага надаецца мадэрнізацыі матэрыяльна-тэхнічнай базы медустаноў. За студзень—чэрвень на гэтыя мэты са сродкаў мясцовых бюджэтаў было выдаткавана 1,8 млрд рублёў, 6,3 млрд — на набыццё абсталявання. У межах праграмы адраджэння вёскі плануецца выканаць работы на 62 аб'ектах аховы здароўя ў аграгарадках. На аснашчэнне сучаснай лячэбна-дыягнастычнай апаратурай перынатальных цэнтраў, якія аказваюць дапамогу дзецям і цяжарным жанчынам, пайшло амаль 950 млн рублёў. Каля 2,2 млрд рублёў за I паўгоддзе выдзелена на рэалізацыю мерапрыемстваў Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

# ГОЛУБ з 11-мятровымі КРЫЛАМІ

## Гаспадар з Пластка працуе на зямлі, здабывае ваду і пакарае неба



*Васіль ГОЛУБ ажыццявіў сваю мару аб небе.*

**Васіль Голуб — асоба вядомая не толькі на роднай Любаншчыне, але і далёка за межамі раёна. Гэта чалавек аўтарытэтны, да яго меркавання многія прыслухоўваюцца і прыязджаюць па парады ці проста ў госці. Васіль Уладзіміравіч усім рады, бо заўсёды можа штосьці карыснае параіць і расказаць аб неардынарных навінах, якія ён у прамым сэнсе «стварае» ўласнымі рукамі. Напрыклад, зараз майструе… самалёт — «інфармацыйную падставу» для візіту на сядзібу Голуба мне доўга шукаць не давялося…**

**ПЕРШЫ ФЕРМЕР**

Сёння Пласток адносна невялікая вёска — значна паменшала тут людзей і мясцовая сярэдняя школа цяпер стала базавай. Раней усё было па-іншаму. Яшчэ некалькі дзесяткаў гадоў таму вясковыя вулкі звінелі ад дзіцячых галасоў. Голуб нарадзіўся ў Пластку, таму пра гісторыю гэтых мясцінаў можа расказаць шмат цікавага. Скончыў школу, пайшоў у войска — пачатак яго жыццёвага шляху можна лічыць тыповым для вясковага хлопца. Трапіў у танкавую часць, дзе адслужыў два гады. Пасля дэмабілізацыі вярнуўся ў родную вёску, уладкаваўся ў райсельгасэнерга, дзе займаўся наладкай электраабсталявання ў гаспадарках раёна. Працаваў у гэтай арганізацыі дзесяць гадоў, удзельнічаў у розных прафесійных спаборніцтвах (не толькі рэспубліканскага, але і саюзнага ўзроўню). Ажаніўся, узвёў уласны дом, нарадзіліся сын і дачушка — навошта нешта мяняць?

Але для творчага і няўрымслівага чалавека вельмі важна паспрабаваць свае сілы ва ўласнай справе. І, нарэшце, з'явілася такая магчымасць у Васіля Уладзіміравіча. У пачатку 1990-х гадоў Голуб стаў адным з першых фермераў на Любаншчыне. Як толькі выйшаў адпаведны закон, ён адразу ўзяў тры гектары зямлі. Пасля плошчу палеткаў павялічыў да 8 га. Аднак вопыт фермерства аказаўся няўдалым.

— У раёне ёсць добрыя землі, а ёсць суцэльны пясок, — тлумачыць Голуб. — Да таго ж мой участак быў далекавата ад сядзібы. Вось і атрымалася, што гаспадарыць у такіх умовах нерэнтабельна. Таму на пэўны час ад фермерства давялося адмовіцца. Пайшоў працаваць у школу, дзе вёў гуртковую работу, пасля на працягу шасці гадоў працаваў памочнікам дэпутата парламента.

Нягледзячы на тое, што апошнім часам сацыяльны статус у Васіля Уладзіміравіча заўважна змяніўся, родны Пласток ён і не падумаў пакідаць. Наадварот, лічыць, што лепшага месца проста не знойдзеш. Голуб зноў узяў на апрацоўку значны кавалак зямлі — цяпер ён арандуе сем гектараў. На гэтых палетках вырошчвае бульбу, якую адразу рэалізуе на крухмальны завод. Таксама засявае збожжавыя — авёс, пшаніцу, ячмень, трыцікале. Збожжа закладвае на захоўванне на зіму і прадае часткамі, па меры неабходнасці ў грашах. Сельскагаспадарчая дзейнасць прыносіць значную частку даходаў сям'і, таму падчас сезона Васіль Уладзіміравіч ад цямна да цямна завіхаецца ў полі. «Сёлета ўраджай неблагі вырас, таму галадаць дакладна не будзем», — усміхаецца гаспадар.



*На ўзлётнай паласе.*

На падворку ў ідэальным стане ўся неабходная тэхніка — збожжа- і бульбаўборачны камбайны, трактар, грузавая машына, прыстасаванне для сарціроўкі бульбы, прычапныя і навясныя агрэгаты. Усе механізмы Голуб перабраў уласнымі рукамі — даводзіў да ладу, удасканальваў. Цяпер гаспадар не толькі працуе на ўласных палетках, але і дапамагае родным, суседзям. Можна лічыць, што ў Пластку працуе сапраўднае «міні-прадпрыемства» па аказанні паслуг насельніцтву. Васіль Уладзіміравіч заўсёды ахвотна прыходзіць на дапамогу: калі я завітаў да яго, Голуб збіраўся абмалочваць прысядзібныя ўчасткі вяскоўцаў.

**ФАНТАН З ФОТАЭЛЕМЕНТАМ**

Сядзібу з высачэзнай мачтай заўважаеш адразу, як толькі паварочваеш у патрэбным напрамку. Сярод месцічаў дасюль ходзяць розныя байкі пра дзівака-суседа. Яшчэ мабыць дваццаць гадоў таму ён устанавіў браму з радыёкіраваннем: націскаеш на кнопку — гасцінна адчыняецца. Вось дык «ноу-хау» было для Пластка, усе прыходзілі паглядзець.

— Тэхнікай захапляўся з дзяцінства, — узгадвае Голуб. — Яшчэ ў пачатковай школе з'явіўся ў мяне свой матацыкл — «Мінск». Пасля былі і «Ява», і «Запарожац». Заўсёды імкнуся нешта зрабіць уласнымі рукамі — я гэтым жыву.

Самы першы камп'ютар Васіль Уладзіміравіч таксама змайстраваў сам — паяў мікрасхемы і сабраў-такі «цуд тэхнікі». Відэамагнітафон набыў, калі толькі ў крамы запісваліся на чаргу, каб атрымаць айчынную «Электроніку ВМ-12» (магчыма, памятаеце такі груваcткі апарат, у які касета запраўлялася зверху). А высокая вышка на падворку — спадчына гадоў «асваення высокіх тэхналогій». Гэтае прыстасаванне некалькі дзесяткаў гадоў таму Голуб зрабіў, каб карыстацца радыётэлефонам. І атрымаў магчымасць размаўляць на адлегласці 30 кіламетраў. Гэта цяпер такія «вопыты» здаюцца крыху дзіўнымі, а ў тыя часы такія навінкі былі запаветнай марай для многіх.

Гаспадар з Пластка ніколькі не адстае ад прагрэсу: пастаянна абнаўляе камп'ютар (мае нават спецыяльную электронную дыягностыку для аўтамабіляў), карыстаецца самай сучаснай тэхнікай. На падворку мноства цікавых прыстасаванняў: відэакамера над брамкай, фантан на фотаэлементах (уключаецца толькі тады, калі нехта з'яўляецца побач, а так — «засыхае», эканоміць электрычнасць). Побач сажалка, агароджа шчодра аплеценая вінаградам, розныя дэкаратыўныя элементы — нават і не скажаш адразу, што вясковая сядзіба. Хіба толькі па цішыні ды, напэўна, па нейкай асаблівай сакавітасці паветра, высокіх пухнатых аблоках і тлустых гусях, якія павольна шпацыруюць за плотам, аб гэтым здагадваешся.

— Каб добра жыць у вёсцы, трэба добра працаваць, — лічыць Голуб. — Акрамя вырошчвання бульбы і збожжавых, прафесійна займаюся яшчэ фота- і відэаздымкамі. Ёсць усё неабходнае лічбавае абсталяванне. Зрабіў устаноўку для таго, каб рабіць свідравіны. У раёне праблема: магчыма, з-за правядзення меліярацыі знікае з калодзежаў вада. Таму вельмі актуальная справа для людзей — калонкі. Сёлета ўжо зрабіў каля паўсотні свідравін. Здабываю ваду на глыбіні да дваццаці метраў, далей рухацца нельга — лічыцца, што гэта прыродныя рэсурсы і на такую дзейнасць неабходна мноства розных даведак. Як бачыце, спрабую сябе ў розных галінах і, здаецца, атрымліваецца някепска.

**САМ САБЕ АВІЯКАНСТРУКТАР**

Але ж галоўная мара Васіля Голуба — неба. Многія з усмешкай кажуць: да гэтага, маўляў, нават прозвішча абавязвае. А ён ніколькі не крыўдзіцца і раз за разам узлятае ў блакітныя прасторы. Узгадвае, што ўпершыню пачуў пра лёгкую авіяцыю яшчэ ў войску, дзе па іроніі лёсу служыў у танкавых войсках. Першыя чарцяжы дэльтапланаў з'явіліся ў часопісе «Мадэліст-канструктар». Голуб шмат разоў перагортваў старонкі з мудрагелістымі схемамі і нарэшце рашыўся зрабіць такую машыну. У 1980-х гадах пачаў майстраваць свой першы дэльтаплан, хоць рэальна яго ніколі не бачыў.

— Рабіў, крыху адрываўся ад зямлі, падаў і зноў падкручваў, — узгадвае Васіль Уладзіміравіч. — Амаль адмовіўся ад гэтай справы, пасля паехаў да сябра ў Брэст і там убачыў дэльтапланы. У аэраклубе «Бусел» хлопцы ўздымаліся ў неба на такой тэхніцы. Адзін з іх навучыў мяне лятаць на дэльтаплане.

З таго часу Голуб пачаў рабіць «крылатую тэхніку». Атрымлівалася больш паспяхова — змайстраваў тры мотадэльтапланы. На апошнім устаноўлены рухавік ад аўтамабіля «Судзукі». Лепш прымяняць авіяцыйны, аднак ён каштуе дарагавата. Увогуле гэтае захапленне не з танных. Адно крыло для дэльтаплана каштуе каля трох тысяч долараў. Яго размах — адзінаццаць метраў. Менавіта такія крылы цяпер «апранае» Голуб, калі ўзлятае ў неба. Узнімаецца на вышыню да кіламетра, аднойчы з 1,2 км парашутыстаў скідваў. Увогуле мотадэльтаплан можа і да 4 кіламетраў дасягнуць. Узлётная паласа непадалёк — трэба мець добрыя навыкі, каб на такіх кароткіх адлегласцях узлятаць і садзіцца. Голуб «пад крылом» ужо пятнаццаць гадоў. І падаць прыходзілася: адзін такі момант (калі ўпаў у возера) нават удалося на відэакамеру зняць. Пасля гэты сюжэт паказвалі ў перадачы «Сам сабе рэжысёр».

Узлятае Васіль Уладзіміравіч, калі ёсць вольны час, добрае надвор'е і... госці. Да яго прыязджалі многія, сярод якіх і знакамітасці — вядомыя спартсменкі Юлія Несцярэнка і Аляксандра Герасіменя. Для адпачынку, лічыць гаспадар, палёты — самая цікавая забава. Толькі падчас жніва няма калі дэльтаплан з ангара выцягваць. Не стае часу і ў майстэрню зазіраць, дзе Голуб пачаў збіраць самы сапраўдны двухмесны аднаматорны самалёт. Спачатку з'ездзіў у Кіеў на авіярамонтны завод: набыў запчасткі, параіўся, як лепш рабіць. Рухавік ад аўтамабіля «Субару» (да таго як займацца аўтамабільнымі фірма выпускала рухавікі для лёгкай авіяцыі) чакае свайго часу. Узімку ў майстэрні Голуб усур'ёз возьмецца за зборку самалёта. Мяркуе, што праз два гады гэтую работу завершыць і ўзляціць у неба.

— Без вялікай мэты сумна жыць на свеце, — кажа Васіль Уладзіміравіч. — Варта да нечага імкнуцца, тады з'яўляецца сэнс. Мне ж яшчэ 46 гадоў і многага можна дасягнуць.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

*Любанскі раён.*

**Транспартная філасофія**

# ЖЫЦЬ, ВЕДАЮЧЫ, ШТО ЗАЎТРА МОЖА НЕ БЫЦЬ

**Мой вагон метро спыніўся не на станцыі. У тунэлі. Запахла паленым. Інстынкт самазахавання спрацаваў імгненна: вочы забегалі, ногі падскочылі, мільён думак у галаве прабег адразу з такой хуткасцю, з якой не рухаецца нават цунамі. Цягнік, як нічога ніякага, пачаў рух. А я зразумела: як хочацца жыць, калі смерць так блізка.**

Я заўсёды спрабую пранікнуць у мозг чалавека, які ведае, што яго жыццё адмерана днямі. Хочацца падтрымаць, падбадзёрыць, парадаваць. Часта не ведаеш, ці можна заводзіць гаворку пра тое, колькі засталося.

Як жыць і разумець — НЕ, не проста разумець, ведаць дакладна, — што заўтра можа не быць? А ніяк! Нават смяротна хворыя пра нешта мараць, размаўляюць пра далёкую старасць і вераць, што гэты момант Усявышні ўсё ж такі адкладзе. Бо нельга жыць з адной думкай. Больш за 5 хвілін (поўных 5 хвілін, сканцэнтраваных толькі на адной думцы пра хуткую смерць!) галава не вытрымае. Яна закіпіць і выбухне.

Мне вядомы розныя прыклады мужнасці і не вельмі мужнасці.

...Наталля, немаладая жанчына, калі ўрачы развялі рукамі і адправілі яе паміраць, стала пустэльнікам-стоўпнікам. Яна не прымала наведвальнікаў, не адказвала на тэлефанаванні. Малілася. Цуд адбыўся. Смяротная пухліна знікла. Цяпер Наталля жыве і атрымлівае асалоду ад кожнага дня.

...17-гадовы Антон таксама адмовіўся ад зносінаў, калі зразумеў, што яму засталося няшмат. Не ад усіх, ад большасці зносінаў. Ён пакрыўдзіў сяброў, загадаўшы больш ніколі не турбаваць яго. Антон адмовіўся ад любых радасцяў. «Мне ўсё роўна», — рэагуе ён на любую з'яву. Ён пахаваў сябе яшчэ жывым, калі за гэты, адмераны, час можна паспець пражыць цэлае жыццё і імкнуцца максімальна насыціць яго. Чаму цяпер усё роўна? Цяпер, калі ён яшчэ жывы! Заўтра можа загінуць нехта, хто сёння адчувае сябе здаровым і не ведае пра лёс. А ў Антона ёсць больш, чым адзін дзень.

...20-гадовая Лідзія доўга змагалася з анкалогіяй. У няроўным баі хвароба перамагла. Апошнія дні Ліда насычае радасцю. І для сябе, і для ўсіх, хто побач. Яна заводзіць новых сяброў, цікавіцца апошнімі навінамі, дастае апошнія сінглы навамодных гуртоў. Усміхаецца. Прыгожа так усміхаецца. Яна зразумела, што нельга траціць найкаштоўнейшыя секунды на хваробу. У апошнім, дадатковым, раўндзе Ліда стала пераможцай. Фізічная нямогласць не зламала яе дух.

Жыць ці дажываць?

**Таццяна САЛДАЦЕНКА.**

*В дополнение к Проектной декларации объекта долевого строительства, опубликованной в № 155 от 20.08.2008 г.*

Договор создания объекта долевого строительства заключаются на:

* **административно-торговое помещение, расположенное в подвальном этаже жилого дома по ул. Шамякина, 9 в микрорайоне «Сухарево-4»:**

- административно-торговое помещение № 1 – **423 066 566 (четыреста двадцать три миллиона шестьдесят шесть тысяч пятьсот шестьдесят шесть) белорусских рублей;**

***Информацию об объекте долевого строительства и ходом работ по его строительству можно получить по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 147. Тел.: (017) 213 51 52, 208 56 41.***

УНН 101225557

**Інфарм-укол**

### БЯСПЛОДНАСЦЬ З-ЗА ХВОРЫХ ДЗЯСНАЎ?

**Пілотнае даследаванне, праведзенае ў адной ізраільскай бальніцы, выявіла магчымую сувязь паміж бактэрыямі, якія выклікаюць захворванні дзяснаў і зніжэннем здольнасці да размнажэння ў мужчын.**

Паводле вынікаў даследавання, у 65 працэнтаў мужчын з нездавальняючымі паказчыкамі спермаграмы, былі выяўлены хваробы дзяснаў. Праўда, аказалася, што амаль у паловы мужчын з нармальнымі паказчыкамі спермы былі выяўлены тыя ж праблемы з дзяснамі. Спецыялісты кажуць, што бясплоднасць можа быць выклікана 500 відамі бактэрый, якія знаходзяцца ў ротавай поласці, і здольны пранікаць у крывяносную сістэму, адкуль наносіць шкоду самым розным органам. Даследаванне паказала, што ў 50 працэнтаў мужчын семявая вадкасць якіх не ўтрымлівае сперматазоідаў, мае быць хранічная хвароба дзяснаў, а бактэрыі, якія выклікаюць гэту праблему, былі знойдзены і ў семявай вадкасці.

### ХВАРОБА НЫРАК І ХІСТАННЕ ВАГІ

**Дадатковыя кілаграмы небяспечныя нават для здаровых людзей з нармальнай вагой: павелічэнне масы цела ў дапушчальных межах можа развіць хранічную ныркавую хваробу.**

Паўднёвакарэйскія спецыялісты прыйшлі да такой высновы пасля аналізу вынікаў даследавання фактараў рызыкі для захваральнасці нырак сярод людзей, якія не мелі вялікіх праблем са здароўем. Мужчыны, якія папраўляліся больш як на 750 грамаў штогод, мелі самую высокую рызыку ныркавай дысфункцыі. Тыя, чыя вага змянялася мінімальна ў межах каля 250 грамаў, у меншай ступені пакутавалі ад ныркавых расстройстваў, але ўсё ж такі рызыка і для гэтай групы заставалася значнай. Медыкі ўпэўненыя, што хістанні вагі пагражаюць праблемамі са здароўем людзям любой камплекцыі.

### ГАРАЧЭЙ КЛІМАТ — БОЛЬШ... КАМЯНЁЎ

**Глабальнае пацяпленне можа выклікаць засуху на вялікіх прасторах зямлі, а таксама прывесці да росту колькасці людзей з мочакаменнай хваробай.**

Прычынай гэтага захворвання часта з'яўляецца абязводжванне, калі арганізм не ў стане вывесці нежаданыя мінералы, што назапашваюцца ў нырках. У даследаванні Універсітэта Тэхаса гаворыцца, што да 2050 года ў выніку павышэння тэмпературы ў самых засушлівых раёнах ЗША мочакаменная захваральнасць можа вырасці на 30 працэнтаў.

**Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.**

*Акционеру ОАО «Универсам Заславль»*

**УВЕДОМЛЕНИЕ О ВОЗНИКНОВЕНИИ У АКЦИОНЕРА ПРАВА ТРЕБОВАТЬ ВЫКУПА ОБЩЕСТВОМ АКЦИЙ ОАО «Универсам Заславль»**

В соответствии со статьей 78 Закона Республики Беларусь «О хозяйственных обществах», по итогам проведения собрания акционеры, не участвующие 22 августа 2008 г. во внеочередном общем собрании акционеров ОАО «Универсам Заславль», или голосовавшие против принятия решения по вопросу № 1 повестки дня (реорганизация ОАО «Универсам Заславль» путем присоединения к ОАО «Гродно-Супер»), имеют право предъявить Обществу требование о выкупе на баланс принадлежащих им акций. В связи с указанным, общим собранием акционеров утверждены условия приобретения Обществом акций собственного выпуска (эмиссии) на баланс по требованию его акционеров (Протокол № 25):

| | |
|---|---|
| Полное наименование и местонахождение Эмитента-Покупателя (акции которого выкупаются) | Открытое акционерное общество «Универсам Заславль» 220035 г. Минск, пр. Победителей, 49 |
| Адрес, по которому будут приниматься заявления акционеров с требованием выкупа, и заключаться договоры купли-продажи акций | 220036 г. Минск, пер. Северный, д. 13, т. (8 017) 213 54 72 УП «Совмедиа» — депозитарий |
| Дата начала подачи заявлений и заключения договоров купли-продажи акций | 25.08.2008 |
| Дата окончания подачи заявлений и заключения договоров купли-продажи акций | 26.09.2008 |
| Цена приобретения акций | 28 935 белорусских рублей |
| Сроки, форма и порядок оплаты акций | в течение 30 банковских дней со дня заключения договора купли-продажи ценных бумаг (акций) и перевода акций на счет «депо» ОАО «Универсам Заславль»; наличным расчетом из кассы Общества |
| Условия приобретения акций по требованию акционеров: | ■ общая сумма денежных средств, направляемых Обществом на выкуп акций по требованию его акционеров, не может превышать десяти процентов стоимости чистых активов акционерного общества на дату принятия настоящего решения;<br>■ в случае, если общее количество акций, предложенных для выкупа по требованию акционеров, превышает количество акций, которое может быть приобретено акционерным обществом с учетом указанного выше ограничения, акции выкупаются у акционеров пропорционально заявленным требованиям;<br>■ приобретение акций Обществом по требованию акционеров не осуществляется в случаях установления законодательством соответствующих запретов (ограничений);<br>■ адрес, по которому будут заключаться договоры купли-продажи акций: г. Минск, пер. Северный, д. 13, 2-й этаж, комн. 19, т. (+37517) 213 54 72, т./ф 213 54 50;<br>■ расходы, связанные с оформлением и исполнением договора, несет Продавец, с возмещением 50 процентов понесенных расходов. |

Документы для оформления сделки Вы можете получить по указанному выше адресу. УНН 100008383

Тэлесеткі

# У НОВЫМ СЕЗОНЕ НА АНТ — БІТВЫ ЗА ПАСАГ, СПАРТЫЎНУЮ СЛАВУ І ВЯЛІКІЯ ГРОШЫ

**Летняе зацішша на тэлеэкранах завяршаецца, і ўжо лічаныя дні засталіся да пачатку чарговага сезона. Тэлеканалы навыперадкі рыхтуюць «бомбы» для прыцягнення ўвагі аўдыторыі. Адным з першых таямніцы новых праектаў прыадкрыў АНТ.**

...Калі толькі пачала спяваць тэнісістка Вольга Барабаншчыкава, а следам за ёй запісаў дуэт з Алесяй Максім Мірны, у журналісцкім асяроддзі нарадзіўся жарт — хутка ў славутыя 75 працэнтаў трапіць зводны хор хакейнага клуба «Юнацтва». Гэтага, праўда, не адбылося, але як спяваюць хакеісты, мы ўсё ж пачуем і нават убачым. Бо ў новым, трэцім па ліку забаўляльным праекце **«Цудоўная пяцёрка»** ўдзельнічаюць члены хакейнага клуба «Керамін»! Акрамя спартсменаў, у спаборніцтве «Пяючых офісаў» (у большасці краін Еўропы гэты праект называецца менавіта так) задзейнічаны каманды Нацыянальнай бібліятэкі, агракамбіната «Сноў», завода Гарызонт, фабрыкі «Камунарка», супрацоўнікаў мытні і іншыя — усяго, як і раней, 10 камандаў.

З сярэдзіны верасня пачнецца рэаліці-шоу **«Пасаг для нявесты»**. Больш як 1000 прэтэндэнтак ва ўзросце ад 18 да 40 гадоў, звязаныя сур'ёзнымі адносінамі з мужчынамі, даслалі свае анкеты на адрас тэлеканала. Цяпер журы адбірае 50 патэнцыяльных нявестаў для ўдзелу ў шоу. На кожным з этапаў спаборніцтва — а гэта будзе менавіта спаборніцтва — прадугледжаны каштоўныя прызы, неабходныя для пачатку сямейнага жыцця (бытавая тэхніка, мэбля і г.д.), а галоўным прызам стануць 25 мільёнаў рублёў на арганізацыю і правядзенне вяселля. Так што, у адрозненне ад папярэдняга праекта АНТ «Тры халасцякі», тут пабрацца шлюбам пары пераможцаў усё ж давядзецца. Здзіўляе іншае: як у першым, так і ў другім праекце адваёўваць права на асабістае шчасце давядзецца чамусьці жанчынам. Напрыклад, на першым этапе рэаліці-шоу «Пасаг для нявесты» паўсотні дзяўчат у спартыўнай экіпіроўцы — шлемы, накаленнікі, налакотнікі — паверх сукенак правядуць забег па адной з цэнтральных вуліц Мінска. 7 лідараў, хто прыбяжыць першымі, стануць удзельніцамі праекта. І далей будзе не лягчэй! Ад кандыдатак патрабуюцца як добрая фізічная падрыхтоўка, так і артыстызм, фантазія, камунікабельнасць, здольнасць спакушаць, моцная воля да перамогі і, натуральна, уменне гатаваць. Ад іх «палавінак», наколькі зразумела папярэдне, патрэбна толькі прынцыповая згода на будучы шлюб. Гм! А раней, кажуць людзі, і нявесту, і пасаг юнаку яшчэ трэба было заслужыць...



Яшчэ адна навінка сезона — праект **«Бітва гарадоў»**, які паспелі ахрысціць беларускай версіяй «Вялікіх гонак». І праўда, спартыўна-забаўляльнае шоу здымалася ў Францыі — на той жа пляцоўцы і па тых жа правілах, што «Вялікія гонкі». Розніца ў тым, што ў беларускім праекце ўдзельнічаюць шэсць камандаў па 12 чалавек, якія прадстаўляюць усе абласныя цэнтры. А ў складзе камандаў — не толькі вядомыя артысты, тэлевядучыя і спартсмены, але таксама інжынеры, урачы, студэнты, выкладчыкі, прадпрымальнікі... «Кардынальнае адрозненне яшчэ ў тым, — удакладняе прадзюсар праекта Сяргей Хоміч, — што мы здымалі нацыянальную праграму, у якой удзельнічаюць толькі беларускія каманды. І на мой погляд, яна атрымалася нават больш відовішчнай, чым расійская версія». Для ўдзелу шукалі людзей з добрай фізічнай падрыхтоўкай — тых, хто займаўся спортам раней і сябруе з ім цяпер. Таксама ў кожную каманду трапілі па 3—4 прафесійныя спартсмены (сярод іх ёсць былыя алімпійскія чэмпіёны і чэмпіёны свету), і па 1—2 эстрадныя выканаўцы. Найбольшая іх колькасць у камандзе Мінска.

Хоць кожны ўдзельнік і падпісваў загадзя паперы, што пра рызыку папярэджаны і прэтэнзій да арганізатараў мець не будзе, прадзюсар прызнаецца, што для яго галоўным уражаннем стала менавіта небяспека, якой падвяргаліся ўдзельнікі. «Я быў насамрэч шакіраваны, не чакаў, што гэта ўсё настолькі сур'ёзна і небяспечна. Калі ўбачыў, што літаральна пасля кожнага конкурсу даводзілася аказваць людзям медыцынскую дапамогу, што многіх адвозяць у шпіталь на рэнтген — рабілася ніякавата. Тут міжволі пасівееш», — напалохаў нас Сяргей Хоміч.

***— Што, здараліся і траўмы, пасля якіх удзельнікі выбывалі з гульні?!***

— Было некалькі вельмі сур'ёзных. Ірына Дарафеева атрымала пералом лапаткі і пашкодзіла пазваночнік, а прадстаўнік каманды Брэста Пётр Воран зламаў руку. Колькасці гузакоў, расцяжэнняў, выцятых месцаў мы ўжо нават не лічылі...

На кану «Бітвы гарадоў» галоўны прыз — 50 мільёнаў беларускіх рублёў для каманды-пераможцы. І яшчэ адзін прыз, на перспектыву: налета каманда-пераможца зможа ўдзельнічаць у складзе зборнай Беларусі (каля 40 чалавек) у міжнародных спаборніцтвах.

***— Думаеце, даведаўшыся пра небяспеку, удзельнікі на наступны праект пойдуць?*** — засумняваліся мы. А вось Сяргей Хоміч не сумняваецца: «Пойдуць. Адрэналін пераважвае ўсё. Калі гледачам гэта будзе цікава, то праект адбудзецца і працягнецца. Ва ўсякім разе, усе перадумовы для гэтага ёсць». Усяго ў праекце «Бітва гарадоў» 9 праграм, якія мы ўбачым на АНТ пачынаючы з сярэдзіны верасня.

Завяршаючы пералік навінак сезона, адзначым, што інтэлектуальнае шоу **«Адзін супраць усіх»** таксама здымаецца па новых правілах. Найперш яны датычацца падказак, так званых Джокераў, а таксама прызавых сум. Цяпер зарабіць грошы ўласным розумам будзе больш складана, але разам з тым і больш цікава. Дарэчы, у першай гульні сезона, якая прайшла па новых правілах і будзе паказана 13 верасня, Калдун сыграе з... Калдуном. Але гэта не раздваенне асобы, проста ў госці да тэлевядучага Георгія Калдуна завітае малодшы брат, спявак Дзмітрый Калдун. Гэта гульня, як расказалі нам на АНТ, — дабрачынная, і ўсе выйграныя грошы будуць накіраваныя на дапамогу дзецям.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота прадастаўлена каналам АНТ.**

# ГРУША

свет і сусвет чалавека

**Груша — дрэва са смачнымі, сакавітымі пладамі, якія, калі прыглядзецца, нагадваюць жаночую фігуру. Можа менавіта таму гэта дрэва ў свядомасці славян стала сімвалам страсці, зямным вобразам першай жанчыны, якая была выгнана з раю.**

● Паўднёвыя славяне ўшаноўвалі грушу як свяшчэннае дрэва, а паданні сведчылі, што людзі маліліся не ў царкве, а пад галінамі старой грушы.

● У міфалогіі ўсходніх славян груша, як вярба і арэх, была звязана з «тым» светам, нячыстай сілай. Па ўяўленнях нашых продкаў, менавіта ў дупле старой грушы жыве чорт. Народны выраз «Закахаўся як чорт у старую грушу» — яскравы доказ таму .

● Невыпадкова на русальным тыдні русалку «заганялі» на грушу, вешалі на грушу вянкі.

● У той жа час «залатым» правілам для гаспадара было абавязкова пасадзіць у сваім садзе грушу, а то і не адну.

● Нашы продкі менавіта грушу надзялялі жыватворнай энергіяй: кветкі, лісце, плады і галінкі выкарыстоўваліся народнымі лекарамі, каб надаць чалавеку ці жывёле жыццёвыя сілы.

● Даволі часта грушу, яе плады, выкарыстоўвалі ў магічных дзеяннях, скіраваных на нараджэнне дзіцяці. Так, каб зацяжарыць, жанчыне раілі з'есці грушу, якая больш за астатнія правісела на дрэве. Для ўмацавання сілаў грушавы напой давалі піць парадзісе.

● Пры першым рытуальным купанні, каб жыццё дзіцяці было салодкім, галінкі ці лісце грушы клалі ў ваду.

● Калі дзіця аднімалі ад грудзей, яго неслі пад грушу і на некаторы час пакідалі там. На Палессі пра народжанае дзіця казалі: «упаў з грушы» ці так: «баба з грушы прынесла».

● Грушу выкарыстоўвалі, каб даведацца пра свой лёс: дзяўчаты, калі варажылі аб вяселлі, надзявалі на грушу пярсцёнкі і ўпрыгожаныя рознакаляровымі стужкамі вянкі.

● На Палессі нявеста, якая ехала на вянчанне, павінна была на кожным скрыжаванні дарог раскідваць сушаныя грушы.

● У Брэсцкім ці Гомельскім Палессі ў сярэдзіну вясельнага каравая абавязкова ўтыкалі дзве абкручаным цестам і запечаныя галінкі грушы. Іх звалі «шышачкі». Адна з іх мела выгляд літары «У» («двайчатка») і была сімвалам нявесты. Другая мела трайное разгалінаванне («трайчатка») і была сімвалам жаніха.

● Груша таксама, як і яблыня, была надзелена сакральнасцю ў дачыненні да сябе: ссекчы грушу лічылася вялікім грахом.

● Лічылася, што жанчыне нельга ўзлазіць на пладаносныя дрэвы, грушу ці яблыню, інакш яны не будуць прыносіць плады.

● Калі плады на маладым дрэўцы паспелі, сталыя людзі раілі першую грушу ці яблык аддаць самаму малодшаму ў сям'і. У такім выпадку дрэва будзе радзіць доўгія гады.

● Народныя лекары раілі ўжываць грушы тым, хто пакутуе ад захворванняў кішэчніка, лішняй вагі, пры сэрцабіцці, дыябеце; у той жа час не раілі есці грушу на пусты страўнік і не запіваць яе халоднай вадой.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## У МІНСКУ ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ КОЛЬКАСЦЬ РАЗВОДАЎ

У Мінску на 1000 шлюбаў прыпадае 600 разводаў. Як паведаміла прэс-сакратар Міністэрства статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь Алена Кандраценка, за 7 месяцаў гэтага года ў сталіцы органамі ЗАГС зарэгістравана 7842 шлюбы і праведзена 4702 працэдуры разводу. У параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года колькасць запісаў аб шлюбе скарацілася на 9,4 працэнта, а агульная колькасць разводаў павялічылася на 2 працэнты.

**Вольга ВАСІЛЬКОВА, «Мінск—Навіны».**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.13 | 20.06 | 13.53 |
| Віцебск — | 6.00 | 19.59 | 13.59 |
| Магілёў — | 6.03 | 19.57 | 13.54 |
| Гомель — | 6.03 | 19.51 | 13.48 |
| Гродна — | 6.28 | 20.21 | 13.53 |
| Брэст — | 6.32 | 20.19 | 13.47 |

**Месяц**
*Апошняя квадра.*
*Месяц у сузор'і Льва.*

**Імяніны**
**Пр.** *ТРЭЦІ СПАС, Аляксандра, Дзяміда.*
**К.** *Сабіны, Віталя, Яна.*




## 29 жніўня

Дзве даты

**1949 год** — СССР правёў першае выпрабаванне атамнай бомбы. Гэта стала адказам Савецкага Саюза на баявое выкарыстанне амерыканцамі зброі, заснаванай на ланцуговай ядзернай рэакцыі. Адразу ж пасля завяршэння Другой сусветнай вайны былыя саюзнікі распачалі вайну «халодную».

**1885 год** — нямецкі вынаходнік Готліб Даймлер стварыў першы ў свеце матацыкл, які быў запатэнтаваны як «Павозка для верхавой язды з газавым рухавіком».



Цытата дня:

***«Звычайна тыя, у каго не хапае разумення, думаюць, што ведаюць больш, а тыя, хто наогул пазбаўлены розуму, думаюць, што ведаюць усё».***
**Джардана Бруна (1548—1600), італьянскі філосаф і паэт.**

Віншуем **Сяргея Іосіфавіча КУЧУКА** з Юрацішак з днём нараджэння. Жадаем шчасця, радасці, моцнага здароўя.
**Родныя са Смаргоні і Маладзечна.**

# ДОБРЫЯ ЛЮДЗІ




### МАТРОСЫ

У Мінску на пляцы Перамогі а дзесятай раніцы біліся матросы. Іх было чалавек з трыццаць. Выглядалі яны ў сваіх безрукаўных цяльняшках ды чорных бесказырках рэвалюцыйна і анархічна. Якое такое марацкае свята яны сабраліся адзначаць на мінскім пляцы Перамогі? Не ведаю... Але большасць матросаў была на моцным падпітку. Раптам самы маленькі матросік падбег да худога і ўдарыў яму ў нос. Той заліўся крывёю і паспрабаваў схапіць маленькага за грудкі, не атрымалася, бо маленькі быў даўгарукі. Ён бы худога збіў канчаткова, каб не тоўсты, які схапіў маленькага за каўнер, павярнуў тварам да сябе і з усяе моцы даў яму кулаком у грудзі. Маленькі паваліўся на зямлю і паспрабаваў ударыць нагою тоўстага ў пахавінне. Тоўсты раз'юшыўся, схапіў маленькага за рэмень і нагавіцы, прыўзняў і зашпурнуў праз кусты ды пад елку. Худы, выціраючы нос ужо добра ўчырванелай насоўкаю, падзякаваў тоўстаму за абарону і збіццё маленькага. Той ляжаў пад елкаю і лаяўся, але падняцца баяўся, бо тоўсты паабяцаў яго прыбіць, калі толькі паспрабуе ўзняцца на ногі. Публіка, што чакала на аўтобусным прыпынку і назірала за бойкаю п'яных матросаў, адназначна радавалася, бо выглядала ўсё па-цыркавому захапляльна, камічна і зусім не праўдзіва.

### АВІЯНОСЕЦ

У горадзе Гаета я разглядаў амерыканскі авіяносец. Штораніцы з яго ўздымаліся самалёты, каб бамбіць Югаславію. Калі ў цябе няма камеры і фотаапарата, дык ты спакойна можаш прагульвацца па прычале і глядзець на вайсковы карабель колькі заўгодна. Я глядзеў, стаяў і глядзеў, побач дзеці лавілі вудамі рыбу, ім было нецікава разглядаць агромністы карабель. Дзеці даўно прызвычаіліся да авіяносца ў сваім старажытным горадзе. А мне ўсё было за дзіва: і авіяносец, і магіла Цыцэрона, і старажытная Гаета, і амерыканскія лётчыкі. Яны здзіўлялі мяне найбольш, бо яны белазуба ўсміхаліся ўсім сустрэчным, яны павольна гулялі па сонечнай Гаеце, яны паводзілі сябе так, як звычайныя адпачыннікі. Нібыта гэта не яны штораніцы ўздымаюць самалёты з палубы авіяносца, нібыта не яны руйнуюць цэлую краіну, нібыта свет справядлівы і ціхамірны...

### АМБАСАДЫ

Схадзіў у пасольства Вялікабрытаніі на прэзентацыю кнігі пра мядзведзя Віні-Пыха, якую зрабіў і выдаў Віталь Воранаў. Стоячы са шклянкаю пустой вады сярод заўсёдных фуршэтнікаў, падумаў: нават пасрэдны літаратар, жывучы ў Беларусі, увесь час наведвае самыя розныя амбасады са шматлікімі мерапрыемствамі, а нашы выбітныя творцы, якія знайшлі прытулак за мяжою, ходзяць адно ў беларускія амбасады, і тое зрэдку.

### СВЕТЛАЦЕНЬ

Святло — жывапіснае, цень — графічны. Калі прамалёўваеш святло, малюнак робіцца жывапісным; калі прапісваеш цень, жывапіс робіцца графічным.

### СКВАР

У горадзе пачаўся такі скрав, такая гарачыня, такая спякота, што людзі пачалі нагадваць кавалкі зваранага сала. Ратунак быў адно ў прахалодзе вады. Яна бясконца пілася і лілася на скуру, пад яе падстаўлялася перагрэтая цяжкая галава. Вада дапамагала мне ўвесь дзень, дапамагла яна і ўночы. Лежачы пад свежаю прасцінoю, я прыгадваў рэчку: бруістую, крынічную, заўсёды прахалодную Ятранку. У дзяцінстве, вярнуўшыся з сонечнага поля і загнаўшы карову ў цёмнае гумно, я прыходзіў на корч, сядаў на яго конна і звешваў у ваду натомленыя ногі. У празрыстую пругкую плынь я апускаў руку і спрабаваў схапіць рэчку, а яна цякла-ўцякала праз пальцы. Ратуючыся ад задухі, я так і прасядзеў цэлую ноч на старым карчы, пад срэбналістай вярбою, якая прыйшла да мяне з далёкага вясковага мінулага.

### КАРЦІНА

Вырашыў напісаць невялікую карціну, з якой хацелася б выпіць. Палатно мусіць быць спакойнае па колерах. На ім будзе намаляваны ідэальны сабутэльнік. Карціну можна павесіць над сталом у варэльні. Менавіта ў варэльні над сталом нейкі час правісела скрадзеная з Луўра Джаконда. Трэба сказаць, што ў варэльні яна ўсміхалася так жа, як і ў Луўры. Увечары, калі заманецца, можна будзе, вярнуўшыся з працы, выпіць з ідэальным сабутэльнікам і пагаварыць з ім. Шмат хто размаўляе ды выпівае з тэлевізарам, многія ўжо навучыліся п'янстваваць з камп'ютарам, але і тэлевізар, і камп'ютар задужа гаваркія, занадта яны шматслоўныя, і настроі ў іх зменлівыя, ды і характары ў іх мітуслівыя, як у кепскіх паэтаў. Мой намалёваны сабутэльнік гаварыць наогул не стане, ён будзе слухаць цябе. Ён выслухае і шчыра паспачувае. Калі ты не захочаш з ім выпіць сягоння, ён не пакрыўдзіцца, бо я навучу яго чакаць. Яшчэ ў ім будзе загадкавасць Сфінкса... Спадзяюся, у мяне атрымаецца новая карціна.



**Адам ГЛОБУС.**




## МІНЧАНЕ ЛЮБЯЦЬ АЎТОБУСЫ

**Самым папулярным гарадскім грамадскім транспартам у жыхароў і гасцей сталіцы сталі аўтобусы. Так, за студзень — ліпень гэтага года аўтобусамі перавезена 143,6 мільёна пасажыраў.**

У той час як метро скарысталіся 142,4 мільёна чалавек, трамваямі і тралейбусамі — 127,8 мільёна. У цэлым жа гарадскім грамадскім транспартам за сем месяцаў гэтага года было перавезена 413,9 мільёна чалавек. У параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года аб'ёмы пасажыраперавозак у сталіцы знізіліся на 2,9 працэнта, а ў падземцы і зусім на 5,5 працэнта.

Радзей сталі карыстацца мінчане і паслугамі прыватных перавозчыкаў. Так, за сем месяцаў 2008 года імі перавезена 2,5 мільёна чалавек, што на 74,7 працэнта менш, чым за аналагічны перыяд 2007-га.

**Святлана ФРАЛЯНКОВА, «Мінск—Навіны».**

## Усміхнёмся!

*10 прычын выйсці замуж.*
*1. Каб маці не сварылася.*
*2. Вам падабаецца марш Мендэльсона.*
*3. Хочацца нарэшце вырвацца з-пад апекі каменданта інтэрната.*
*4. Рашуча няма чаго надзець, вось толькі гэтая беленькая сукеначка з вэлюмам.*
*5. Жыццё праходзіць, трэба напрыканцы пляснуць дзвярыма!*
*6. Каб ужо не гатаваць усякіх там бефстроганаў, а проста каструлю капусты на ўвесь тыдзень.*
*7. Каб ужо высвятліць, нарэшце, тэлефоны ўсіх міліцый, бальніц і моргаў.*
*8. Каб нарэшце сапраўды высвятліць, хто менавіта сапсаваў твае лепшыя гады.*
*9. Каб усё для яго, мярзотніка! А ён!..*
*10. На вяселлі пагуляць.*

☺

**Унук пытаецца ў дзядулі, які працуе вартаўніком:**
**— А страшна ўначы дзяжурыць аднаму?**
**— Ды, унучак, пакуль не заснеш — страшна!**

☺

*Чым адрозніваецца дзіцячы садок ад ваенкамата?*
*Каб аддаць дзіця ў садок, трэба даць хабар. Ваенкамат працуе па зваротным прынцыпе.*

☺

**Сустракаюцца дзве сяброўкі:**
**— Ой, як ты схуднела! Нейкая спецыяльная дыета?**
**— Так! Шклянка вады з-пад крана. Адзін раз за тры дні да ежы.**




ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА IV КВАРТАЛ 2008 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

Насуперак Чарнобылю. Местное самоуправление. Свая справа. Жыцьцяндоля. Чырвоная змена. Купі лепшае! Краіна здароўя

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 9200 рублёў на месяц<br>27600 рублёў на квартал |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 8700 рублёў на месяц<br>26100 рублёў на квартал |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 14700 рублёў на месяц<br>44100 рублёў на квартал |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 13400 рублёў на месяц<br>40200 рублёў на квартал |

ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ» (праз кіёскі Мінгарсаюздруку)

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 7700 рублёў на месяц<br>23100 рублёў на квартал |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 7230 рублёў на месяц<br>21690 рублёў на квартал |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 10330 рублёў на месяц<br>30990 рублёў на квартал |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 9760 рубелёў на месяц<br>29280 рублёў на квартал |

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.948 Індэкс 63850. Зак. № 4721. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12